Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 ЖНІЎНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 153 (28011) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Не хочам быць «Еўрабачаннем»

СТАР. 4



## Штрафы для «чуллівых»

СТАР. 8

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



## Андрэй Белякоў: «БРСМ важна быць у трэндзе»

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Міністэрствы і ведамствы павінны больш актыўна працаваць у сацыяльных сетках. Сёння не ўсе міністэрствы разумеюць, што зачастую старонкі ў сацмедыя больш папулярныя і запатрабаваныя, чым афіцыйныя сайты. Шмат шырэй неабходна выкарыстоўваць рэсурсы сацыяльных сетак, і нам трэба ўдасканальваць гэтую работу на ўзроўні дзяржаўных органаў улады, грамадскіх структур і ўсіх сістэм, заклікаю забяспечыць камунікацыю паміж дзяржавай і грамадствам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15989,00 | ▲ |
| Еўра | 17759,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 245,87 | ▼ |
| Укр. грыўня | 750,66 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Размова на роўных



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*У заасадзе цэнтра экалагічнага турызму «Станькава» агракамбіната «Дзяржынскі» ўпершыню птушаняты афрыканскіх страусаў вывеліся не з дапамогай інкубатара, а ў натуральных умовах — непасрэдна праз высёджванне яек. Месяц таму ў страусіных вальерах з'явілася яшчэ 5 птушанят, і цяпер у цэнтры налічваецца 16 экзатычных птушах — амаль цэлая ферма. Шосты год працуе загадчыкам заасада ў «Станькаве» Міхаіл Турыгін (на фота), і штодзённыя зносіны з жывёламі і птушкамі робяць гэтага шчырага заўзятара прыроды сапраўдным сябрам насельнікаў заапарка.*

■ Фінансы

## СТАЎКА НА БЕЗНАЯЎНЫЯ



**Сістэма безнаяўных разлікаў Беларусі пастаянна ўдасканальваецца. Паводле інфармацыі Нацбанка, зараз у краіне налічваецца каля 12,3 млн плацежных картак, што на 12% больш, чым на аналагічную дату 2013 года. Доля безнаяўных аперацый на пачатак ліпеня склала 75,4% па колькасці і 30,4% па суме аперацый з картамі. Нацбанк імкнецца зацікавіць жыхароў краіны самымі разнастайнымі спосабамі: уводзіць прынцып нулявой адказнасці для трымальнікаў банкаўскіх карт, выкарыстоўвае бескантактавыя сістэмы разлікаў. Акрамя таго, асаблівыя перспектывы бачаць і ў развіцці сістэмы інфакіёскаў, звязанай з продажам тавараў і паслуг.**

### ПА НУЛЯХ

Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Аляксандр СОТНІКАЎ**, у Беларусі адзін з самых нізкіх узроўняў махлярства з банкаўскімі карткамі ў ЕАЭС. Пра гэта сведчыць і колькасць заяў, якія паступалі ў беларускія банкі ад уладальнікаў карт.

За першае паўгоддзе 2015-га ў банкі паступіла 1227 такіх заяў. Па 821 з іх ужо вярнулі грошы. Аднак, нягледзячы на такую невялікую лічбу, па 354 заявах грашовыя сродкі не вярнуліся да ўладальнікаў, а яшчэ па некаторых вядзецца разбіральніцтва. 5 жніўня ў Беларусі ў сілу ўступіў прынцып нулявой адказнасці для трымальнікаў банкаўскіх карт. Згодна з ім, устаноўлены тэрміны на падачу кліентамі пісьмовых заяў аб несанкцыянаваным зняцці грошай — 30 дзён. На іх разгляд і прыняцце рашэнняў аб вяртанні сродкаў банкам адводзіцца 45 дзён, калі аперацыя была здзейснена на тэрыторыі Беларусі, і 90 дзён — калі па-за межамі краіны.

СТАР. 3

■ Учынак!

## З РЫЗЫКАЙ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Бабруйскія ратавальнікі Васіль Сямашка і Станіслаў Длускі прадухілілі выбух на газаразмеркавальнай станцыі

**Трывожны сігнал пра тое, што гарыць газаправод, паступіў бабруйскім ратавальнікам з вёскі Вялікія Бортнікі. Відовішча было не для слабанервовых. Ціск газу ў трубаправодзе дыяметрам 160 міліметраў на момант прыбыцця першага падраздзялення складаў 6 атмасфер. З-пад фланцавага злучэння газаправода біў вогнены факел вышынёй прыкладна 8 метраў. Усё гэта суправаджалася такім гулам, быццам бы недзе побач на пасадку заходзіў верталёт.**

Пры гарэнні газу тэмпература ў ачагу можа дасягаць плюс 950 градусаў. Металічныя канструкцыі пры такіх умовах могуць пратрымацца ад 15 да 30 хвілін, потым пачынаюць разбурацца. Таму ратавальнікі адразу ж сталі ахалоджваць газаразмеркавальную трубу вадой. Але трэба было найперш за ўсё перакрыць засаўку.

СТАР. 2



# КАБ ЗАХАЦЕЛАСЯ ДА НАС ВЯРНУЦЦА

Сустрэчы дзяцей з Беларусі і Кітая будуць спрыяць плённаму ўзаемадзеянню паміж краінамі



Фота БЕЛТА.

**Такое меркаванне выказала намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА падчас сустрэчы з дзецьмі з КНР, якія прыехалі на аздараўленне ў «Зубраня», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Як адзначыла Наталля Качанава, візіт кітайскіх дзяцей у Беларусь стаў магчымы дзякуючы сяброўскім адносінам паміж абедзвюма краінамі, а таксама дамоўленасцям, дасягнутым кіраўнікамі дзяржаў. Летась з падобным візітам у Кітай ездзілі беларускія дзеці. «Я думаю, што такія сяброўскія візіты нашых дзяцей стануць добрай традыцыяй. Несумненна, гэта будзе спрыяць плённаму супрацоўніцтву паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Беларуссю», — сказала яна.

Намеснік прэм'ер-міністра выказала надзею, што візіт у Беларусь спадабаецца кітайскім дзецям. «Магчыма, ён стане для вас знакавым, і многія з вас захочуць вярнуцца ў нашу краіну, каб сустрэцца з сябрамі, якіх вы тут знойдзеце, а магчыма — і працягнуць вучобу ў нашай цудоўнай краіне», — адзначыла Наталя Качанава.

Кітайскія госці будуць знаходзіцца ў Беларусі з 10 па 19 жніўня. У праграме адпачынку не толькі аздараўленчыя працэдуры. Для дзяцей падрыхтавана насычаная праграма. Яны будуць удзельнічаць у адукацыйных, забаўляльных мерапрыемствах. Таксама для іх арганізуюць азнаямленне з гістарычнай і культурнай спадчынай Беларусі.

# УЗВАЖАНАЯ, АДКАЗНАЯ ЖУРНАЛІСТЫКА

Гэта той крытэрый, які вызначае папулярнасць у чытачоў і гледачоў

**Такое меркаванне выказала міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік ведамства звярнула ўвагу, што СМІ самастойныя ў сваёй рэдакцыйнай палітыцы і закон забараняе ўмяшанне ў яе. «Але самая галоўная задача, якая сёння ёсць у нашага інфармацыйнага поля, — у поўным аб'ёме забяспечыць канстытуцыйнае права грамадзян на атрыманне дакладнай і поўнай інфармацыі, а таксама прыцягнуць іх на выбарчыя ўчасткі. Сёння беларусы не безуважныя да сваёй будучыні і да выбару гэтай будучыні», — лічыць Лілія Ананіч.

Пры гэтым, па яе словах, рэдакцыям не варта апускацца да «жаўцізны», якую эксплуатуюць асобныя інтэрнэт-рэсурсы. «Думаю, што ўзважаная, адказная журналістыка — той крытэрый, які вызначае папулярнасць у аўдыторыі чытачоў і гледачоў, — сказала Лілія Ананіч. — Першыя радкі публікацыі альбо сюжэту адразу паказваюць, што журналіст хоча сказаць свайму гледачу, слухачу, чытачу».

Па словах міністра, беларуская інтэрнэт-прастора ўвогуле прыслухоўваецца да патрабаванняў заканадаўства. Закон аб сродках масавай інфармацыі, які ў абноўленым выглядзе працуе з 1 студзеня 2015 года, увёў адказнасць інтэрнэт-рэсурсаў за інфармацыю, якая распаўсюджваецца. «26 інтэрнэт-рэсурсаў прыпынілі, спынілі сваё існаванне з прычыны распаўсюджвання інфармацыі, якая супярэчыць заканадаўству краіны», — заўважыла Лілія Ананіч. Паводле яе слоў, гэта ў першую чаргу звязана з фактамі выяўлення інфармацыі пра наркотыкі, неналежнай рэкламай лекавых сродкаў, ужываннем ненарматыўнай лексікі. «Зараз актывізавалі сваю работу рэспубліканская і галіновыя камісіі па вызначэнні ў друкаванай прадукцыі прыкмет наяўнасці экстрэмісцкай дзейнасці, і мы бачым, што шэраг рашэнняў ужо прыняты ў судовых інстанцыях. Інтэрнэт-прастора сёння прыслухоўваецца да патрабаванняў заканадаўства, але рана казаць пра тое, што закон аб СМІ ў поўным аб'ёме ўсімі рэсурсамі выконваецца», — сказала міністр.

Па яе словах, тое, што кожнае рашэнне, якое выносіцца Міністэрствам інфармацыі, актыўна абмяркоўваецца на форумах і ў сацыяльных сетках, сведчыць: грамадства не абыякавае да існуючых працэсаў. «Неабыякавыя і грамадзяне, якія звяртаюцца, пішуць у Міністэрства інфармацыі, адзначаючы на тых ці іншых рэсурсах праявы той ці іншай дэструктыўнай інфармацыі», — адзначыла Лілія Ананіч.

■ На думку парламентарыя

**Алена ШАМАЛЬ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:**

# «СЁННЯШНЯЯ МОЛАДЗЬ — ЛЮДЗІ З АКТЫЎНАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ ПАЗІЦЫЯЙ»



**На гэтым тыдні адзначаўся Міжнародны дзень моладзі. Ён быў устаноўлены Генеральнай Асамблеяй ААН у канцы 1999 года, а ўпершыню яго адсвяткавалі ў 2000-м. Маладыя людзі ў нашай краіне складаюць прыкладна пятую частку ўсяго насельніцтва. Алена Шамаль, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, расказала карэспандэнту «Звязды» пра маладзёжную палітыку ў краіне, а таксама падзялілася сваімі меркаваннямі наконт сённяшняга маладога пакалення.**

***— Як маладзёжная палітыка рэалізуецца ў нашай дзяржаве?***

— Калі казаць пра маладзёжную палітыку і пра адносіны дзяржавы да моладзі, то, магчыма, будзе трошкі банальна, калі я скажу: моладзь — тая будучыня, на якую робіць стаўку сучаснасць. Што да параўнання з іншымі краінамі, то кожная дзяржава вызначае нюансы маладзёжнай палітыкі, зыходзячы са сваёй канкрэтнай сітуацыі, са сваіх магчымасцей. Напрыклад, у Беларусі моладзі ў заканадаўчым плане прысвечаны 8 кодэксаў, каля 20 законаў, прыкладна 40 указаў Прэзідэнта і недзе 200 пастаноў урада. Усе гэтыя нарматыўныя дакументы ў той ці іншай ступені закранаюць жыццё маладых людзей менавіта ў сферы нейкіх прэферэнцый для іх — у адукацыі, ахове здароўя, атрыманні першага працоўнага месца, у льготах па крэдытах.

Калі казаць пра міжнародную сферу, то, як вы ведаеце, Беларусь уваходзіць у Міжпарламенцкую асамблею СНД. З 2012 года там працуе Міжпарламенцкая асамблея па справах моладзі. Краіны, якія ўваходзяць у Міжпарламенцкую асамблею СНД, абменьваюцца сваім вопытам па працы з маладым пакаленнем, тымі прэферэнцыямі, што ёсць у кожнай дзяржаве, і праблемамі, з якімі сутыкаюцца маладыя людзі. Кожную дзяржаву ў маладзёжнай асамблеі прадстаўляе моладзь ва ўзросце да 30 гадоў.

Апошняе пасяджэнне асамблеі было ў красавіку 2015-га. У гэтым годзе наша краіна старшынствуе там. У рамках працы органа было распрацавана 3 модульныя законы, якія прапануюцца для прыняцця ўсім краінам — удзельніцам арганізацыі.

> **«Маладыя людзі звяртаюцца з прапановамі наконт размеркавання, атрымання адукацыі. Моладзь прыходзіць з вялікім жаданнем, верай, што гэта будзе рэалізавана».**

Дзяржавы потым самастойна разглядаюць гэтыя законы і рашаюць, прымаць іх або дапрацаваць. У модульных законах Міжпарламенцкай асамблеі па справах моладзі закранаюцца такія сферы жыцця маладых людзей, як вольны час, студэнцкія атрады, супрацоўніцтва маладых вучоных краін — удзельніц СНД.

У нас у краіне сёння пытанне аб студэнцкіх атрадах дастаткова распрацавана. Ёсць адпаведны ўказ Прэзідэнта. Ёсць такое паняцце, як усебеларуская будоўля. Гэта таксама бонус для моладзі, якая можа падчас летніх канікул папрацаваць і зарабіць.

У краіне дастаткова шмат маладых людзей — больш за два мільёны чалавек. Аднак асноўная маса пражывае ў гарадах, прычым у буйных. Штогод разглядаюцца пытанні міграцыі: куды рухаюцца маладыя людзі. Ёсць асаблівасць: маладыя жанчыны больш актыўна рухаюцца ўнутры краіны, а маладыя мужчыны — актыўней выязджаюць за мяжу. Узнікае пытанне пра тое, як гэтую міграцыю накіраваць у правільнае русла: каб маладыя людзі заставаліся ў краіне, працавалі ў роднай вёсцы. Тут дзейнічаюць і заканадаўчыя акты аб першым працоўным месцы, зараз уступіў у сілу ўказ аб развіцці паўднёва-заходніх рэгіёнаў Магілёўскай вобласці, які таксама прадугледжвае аказанне пэўнай падтрымкі іх жыхарам.

***— Вам асабіста часта даводзіцца сустракацца з маладымі людзьмі?***

— Маладыя людзі прыязджаюць на сустрэчы ў парламент: па запрашэнні або па ўласнай ініцыятыве. Як правіла, гэта людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Яны члены студэнцкіх актываў ва ўніверсітэтах, сярэдніх і спецыяльных навучальных установах.

Праводжу таксама сустрэчы са студэнцкімі калектывамі ў сябе ў акрузе. Яны рознафарматныя. Напрыклад, калі абмяркоўвалі Закон аб асновах маладзёжнай палітыкі, то праводзілі ў рэгіёнах круглыя сталы, каб была зваротная сувязь, і моладзь з Бабруйшчыны, маёй акругі, была дастаткова актыўнай.

Маладыя людзі прыходзяць да мяне на прыём — гэта прыкладна чвэрць усіх наведвальнікаў. Асноўныя пытанні, з якімі яны звяртаюцца, — гэта пытанні працаўладкавання, жыццёва-камунальнай гаспадаркі, паляпшэння інфраструктуры, таксама моладзь прыходзіць са сваімі рацыяналізатарскімі прапановамі па ўнясенні нейкіх змяненняў у заканадаўства, як правіла, прапановы тычацца маладога пакалення.

***— Якія рацыяналізатарскія прапановы вы пачулі ад маладых людзей?***

— Быў у мяне выпадак, калі малады чалавек прыйшоў з праектам удасканалення водазбору.

Што да змяненняў у заканадаўства, то маладыя людзі прыходзяць з прапановамі наконт размеркавання, атрымання адукацыі. Моладзь прыходзіць з вялікім жаданнем, верай, што гэта будзе рэалізавана.

***— Што вы ўвогуле можаце сказаць пра сучасную моладзь?***

— У нас яна добрая: разумная, актыўная — проста мы часам за ёй не паспяваем. Чым старэйшы ўзрост, тым меншая хуткасць... А ў моладзі хуткасць мыслення, генерацыі ідэй нашмат вышэйшая. Натуральна, яны больш разумныя, больш развітыя, чым мінулае пакаленне, — гэта эвалюцыя. Да моладзі, адназначна, трэба прыслухоўвацца.

***— У краіне, рэгіёне праводзіцца шмат конкурсаў, праектаў. Наколькі, на вашу думку, маладыя людзі выкарыстоўваюць магчымасці заявіць пра сябе?***

— Сапраўды, гэта конкурсы, праекты па розных напрамках. Але не ўсе маладыя людзі ведаюць пра іх. Часам чалавека трэба накіраваць у неабходнае русла, праінфармаваць яго. Нягледзячы на тое, што працуюць і ўпраўленні па працы з моладдзю, і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, на жаль, маладыя людзі, асабліва ў рэгіёнах, адносяцца да гэтага трошкі пасіўна.

Ёсць яшчэ так званая нефармальная моладзь, якая адрозніваецца ад іншых. Яна трымаецца як бы ў цені, хоча, каб яе не абмяркоўвалі. Але гэта вельмі цікавыя маладыя людзі, іх таксама трэба па магчымасці далучаць да розных конкурсаў.

З моладдзю трэба размаўляць не з пазіцыі дарослага. Неабходна мяняць падыходы — працаваць для моладзі, слухаць, што яна прапануе, і даваць ёй магчымасць рэалізоўваць сябе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

■

# З РЫЗЫКАЙ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яна ж знаходзілася ў калодзежы ў 5 метрах ад эпіцэнтра пажару, тэмпература там вымяралася сотнямі градусаў. І трэба было мець вялікую мужнасць, каб рызыкнуць спусціцца на глыбіню 3 метраў і перакрыць выхад газу.

**Камандзір аддзялення ПАВЧ №1 Ленінскага раёна горада Бабруйска, старшына ўнутранай службы Васіль СЯМАШКА** ўзяў на сябе адказнасць здзейсніць гэты рызыкоўны манеўр. Як-ніяк майстар спорту па гімнастыцы. Падстрахоўваў яго сябар **Станіслаў ДЛУСКІ, пажарны гэтай жа часці.** «Ён майстар спорту па гірах, — усміхаецца Васіль. — Калі б нешта здарылася са мной, ён бы мяне, як кацяня, адной рукой выцягнуў». Увесь час, пакуль сябры выконвалі сваё заданне, калегі палівалі іх вадой. На шчасце, усё абышлося. Старшына перакрыў засаўку, і небяспека адступіла. Нехта скажа: «Што ў гэтым гераічнага? Гэта ж іх работа». Але ці шмат сярод нас такіх, якія ў хвіліну небяспекі, гатовы зрабіць усё, што ад іх залежыць?

— Я не першы год на гэтай службе, і тое, што здзейснілі мае калегі, заслугоўвае павагі, — прызнаўся **спецыяліст групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Уладзімір БУТКО.** — Калі б не іх самасвядомасць, памеры бяды маглі б быць куды большыя. Дарэчы, другая засаўка знаходзілася на адлегласці 6 кіламетраў ад месца здарэння. Але хлопцы рызыкнулі і выйшлі пераможцамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Паритетбанк» (Продавец)**
**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
**по продаже изолированного нежилого помещения биллиардного зала с кафе**
**с инв. №500/D-696153 (Объект),**
**расположенного по адресу: г. Минск, пер. Загородный 3-й, д. 4В-3.**

**Начальная цена с НДС – 6 953 808 000 бел. руб.**
**Задаток – 695 380 800 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже помещения биллиардного зала с кафе ОАО «Паритетбанк»,* **проводимом 26 августа 2015 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится **26.08.2015 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 24.08.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.01.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Добрая навіна

# У ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ

## забяспечаны падручнікамі школьнікі да пачатку новага навучальнага года

**Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік дырэктара па навукова-даследчай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі доктар педагагічных навук Людміла ХУДЗЕНКА.**

Паводле яе слоў, у новым навучальным годзе ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе выкарыстоўвацца 499 найменняў падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. З іх 249 найменняў — ва ўстановах з беларускай і 250 — з рускай мовамі навучання.

Сярод навучальных дапаможнікаў ёсць выдадзеныя ўпершыню. Гэта навучальныя дапаможнікі па кітайскай мове для 10-га класа, па нямецкай і французскай мовах для 7-га класа гімназій, па англійскай — для 11-га класа гімназій. Таксама выдадзена 14 найменняў навучальных дапаможнікаў, выкананых на аснове рэльефна-кропкавай сістэмы Брайля для дзяцей з парушэннем зроку. Падрыхтаваны да выдання рабочыя сшыткі для пяціклааснікаў па новым навучальным прадмеце — «Мастацтва. Айчынная і сусветная мастацкая культура».

Да 1 верасня перавыдадзена 103 найменні падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Паводле слоў Людмілы Худзенкі, з кожным новым перавыданнем навучальны дапаможнік становіцца лепшым. «Арганізуецца ўся неабходная праверка ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Усе атрыманыя ад педагогаў заўвагі паступаюць у Нацыянальны інстытут адукацыі, навучальнае выданне дапрацоўваецца і карэктуецца», — адзначыла Людміла Худзенка.

Увогуле, тэрмін выкарыстання падручнікаў складае ад 4 да 7 гадоў. Гэта залежыць ад колькасці вучэбных гадзін, адведзеных на той ці іншы прадмет. «Калі навучальны прадмет вывучаецца 1-2 гадзіны на тыдзень, то тэрмін выкарыстання падручніка складае 5 гадоў. Калі на вывучэнне прадмета адведзена 4 і больш гадзін, выданне выкарыстоўваецца 4 гады, а тыя, якія неабходны вучням для работы ў класе (напрыклад, зборнікі задач і падручнікі па працоўным навучанні для хлопчыкаў і дзяўчынак), выкарыстоўваюцца на працягу 7 гадоў. Пасля заканчэння гэтага тэрміну падручнікі перавыдаюцца», — адзначыла **начальнік упраўлення навучальнага кнігавыдання Нацыянальнага інстытута адукацыі Алена СІГАЕВА**.

Спецыялісты таксама развеялі міф наконт таго, што ў школах выкарыстоўваюцца састарэлыя падручнікі. Штогод Міністэрствам адукацыі зацвярджаецца дакумент з пералікам падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, прыдатных да выкарыстання ў новым навучальным годзе. Калі падручнік папярэдняга года выдання не пазначаны ў гэтым пераліку, ён падлягае спісанню і не выдаецца дзецям.

■ Чытач — газета

# «ЗВЯЗДА» ПРЫНОСІЦЬ ШЧАСЦЕ

**...Педагогі, мусіць, і сапраўды былымі не бываюць? У прыватнасці, нават па свой прыз у рэдакцыю «Звязды» настаўніца беларускай і рускай мовы-літаратуры Эмілія Іванаўна Васілевіч прыехала падрыхтаваўшыся — загадзя «накідала планчык».**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Спачатку расказала, што газету ўпадабала ўслед за сваімі бацькамі («яны «Звязду» ўсё жыццё выпісвалі»), потым, што сама каторы ўжо год з задавальненнем чакае і чытае наш «Ігуменскі тракт», «Жырандолю», «Здароўе», «Сямейную газету», што вельмі падабаюцца звяздоўскія фотаздымкі (асабліва Анатоля Клешчука), крыжаванкі (найбольш — крыжаванкі-пераклады), конкурс «Хто каго?»...

Падабаецца, вядома ж, і тое, што газета разыгрывае прызы. Таму Эмілія Іванаўна, афоміўшы падпіску ў сваім любімым 94-м аддзяленні сувязі Мінска, пастаянна дасылае ў рэдакцыю карткі на розыгрыш. Ёй, як прызналася, нават шчасціла ўжо: гадоў сем-восем таму выйграла фен.

На суперпрыз (а ў апошняй гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» гэта былі арэлі), падпісчыца кажа, нават не разлічвала. Яшчэ і таму, што лецішча не мае... Але ж калі выйграла, «пляцоўка» знайшлася адразу: дача ёсць у пляменніцы, і арэлі там ужо чакаюць, ледзь не графік склалі, хто калі будзе гушкацца...

З чаго Эмілія Іванаўна робіць высновы, што не, не страціў актуальнасці верш, які яе зямляк Анатоль Астрэйка напісаў амаль пяцьдзясят гадоў таму: для беларусаў наша газета па-ранейшаму застаецца «пуцяводнай «звяздой». І прыносіць шчасце 98 гадоў!

— Прыгожая гэтая дата, — зазначыла на развітанне Эмілія Іванаўна. — А налета 9 жніўня газеце 99! Гэта ж як выглядае, і як гучыць!.. Не кажучы ўжо пра 100! Цікава разам дажыць і потым адзначыць!

Хто б спрачаўся. Мы, вядома ж, не будзем.

**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

■

# СТАЎКА НА БЕЗНАЯЎНЫЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Вызначэнне таго, спрацавалі ў тым ці іншым выпадку ашуканцы альбо не, датычыцца кампетэнцыі банкаў. Таксама, па інфармацыі Нацбанка, тэрмін падачы заявы падаўжаецца, калі ў кліента была ўважлівая прычына, у прыватнасці калі чалавек хварэў ці знаходзіўся па-за межамі краіны. Калі такой прычыны няма, то банк можа адмовіцца вярнуць кліенту грошы: той спазніўся з заявай. Магчыма адмова ў кампенсацыі і тым, хто парушыў парадак выкарыстання карткі, праз што ў выніку і пазбавіўся грошай. Менавіта з уводам дадзенага прынцыпу на заканадаўчым узроўні можна меркаваць, што захоўваць сродкі на картцы стане яшчэ бяспечней. Дзеля таго каб урэгуляваць гэтыя пытанні, у Беларусі пры Асацыяцыі беларускіх банкаў сфарміравана рабочая група для стварэння стандартаў працы з прынцыпам нулявой адказнасці.

«Нашы банкі самі выступілі ініцыятарамі вынясення пытання аб выпрацоўцы нейкіх стандартаў працы з такім прынцыпам», — адзначыў Аляксандр Сотнікаў. Паводле яго слоў, у Беларусі ёсць разуменне, што рэгуляванне можа быць не толькі з боку органаў дзяржаўнага кіравання, але і з боку рынку. Плануецца, што рабочая група распрацуе праект метадычных рэкамендацый да правядзення расследаванняў, якія дазваляюць устанавіць факт парушэння трымальнікам карткі парадку яе выкарыстання, што прывяло да несанкцыянаванай аперацыі, а таксама даказаць ашуканскі намер кліента.

Пры гэтым Аляксандр Сотнікаў звярнуў увагу, што за мяжой практыка прымянення нулявой адказнасці вельмі адрозніваецца па падыходах. «Ёсць краіны, напрыклад, у якіх устаноўлена верхняя мяжа, умоўна кажучы, у 150 еўра, і вышэй за яе нічога не кампенсуецца. І, наадварот, існуе мяжа ў 50 еўра, і да яе нічога не кампенсуецца», — удакладніў спецыяліст і дадаў, што заканадаўства ў любым выпадку стаіць на баку трымальніка.

## ШТО ЗА ЭКВАЙРЫНГ?

Нацбанк Беларусі праводзіць кансультацыі з міжнароднымі плацежнымі сістэмамі і сістэмай БЕЛКАРТ, накіраваныя на памяншэнне міжбанкаўскага ўзнагароджання, якое з'яўляецца важкай доляй у сабекошце платы за эквайрынг (прыём да аплаты плацежных карт у якасці сродку аплаты тавараў, работ, паслуг, які выконвае банк-эквайер шляхам усталявання на прадпрыемствах гандлю (паслуг) плацежных тэрміналаў).

«Пасля першай нашай кансультацыі мы бачым разуменне з боку плацежных сістэм і спадзяёмся, што зможам яшчэ больш знізіць тыя тарыфы, гэта прывядзе да пэўнага зніжэння сум, якія збіраюць банкі за эквайрынг з арганізацый гандлю і сэрвісу», — заўважыў Аляксандр Сотнікаў.

Як адзначыў спецыяліст, зараз банкам рэкамендавана захаваць практыку ўстанаўлення памеру платы за эквайрынг для суб'ектаў гаспадарання на дагаворнай аснове. Банкі цяпер выкарыстоўваюць дыферэнцыяваны падыход ва ўстанаўленні памеру платы за эквайрынг у залежнасці ад катэгорый суб'ектаў гаспадарання, тыпаў банкаўскіх плацежных картак.

## БУДУЧЫНЯ ІНФАКІЁСКАЎ

У перспектыве інфакіёскі па продажы тавараў і паслуг, па словах Аляксандра Сотнікава, будуць адрозніваца ад тых, што ўсталяваны зараз. Сур'ёзны напрамак — усталяванне бензаматаў, паркаматаў і далейшае развіццё гэтага сегмента. Акрамя таго, кіраўнік ведамства нагадаў, што сёлета з 1 ліпеня ў Беларусі ажыццяўляецца выпуск картак БЕЛКАРТ, VISA і MasterCard з магнітнай паласой і мікрапрацэсарам стандарту EMV. На картках нацыянальнай плацежнай сістэмы для разлікаў унутры краіны чып павінен з'явіцца з 1 студзеня 2017 года. Зараз беларускія банкі ўжо пачалі выпуск банкаўскіх картак міжнародных плацежных сістэм з чыпам.

Таксама Аляксандр Сотнікаў адзначыў: пры прыняцці летась рашэння аб пераходзе на чыпавыя тэхналогіі ў Нацбанку думалі яшчэ і пра тое, што інфакіёскі бяспечнейшыя, бо там выконваюцца толькі лакальныя плацяжы. «Улічваючы развіццё рынку інфакіёскаў, бензаматаў, мы рэкамендуем банкам звярнуць увагу на развіццё чыпавых тэхналогій у інфакіёсках і выпрацаваць планы па пераходзе на іх», — заўважыў спецыяліст.

Да слова, у Беларусі зараз налічваецца каля 3619 інфакіёскаў (на 4% больш у параўнанні з той жа датай летась), з іх 666 (18%) прымаюць карткі стандарту EMV.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Актуальна

# Мелкаводдзе і няспраўныя касілкі

## становяцца асноўнымі прычынамі летняга траўматызму

**Гісторыі пра бравых гора-ныраў рэдка заканчваюцца шчасліва. Гэтая не выключэнне. Кампанія маладых людзей адпачывала ў выхадныя на возеры. Месца знаёмае, глыбіня вадаёма невялікая — можна і паныраць. Адзін з хлопцаў не разлічыў сілы: зачапіў галавою дно. Але быццам бы абышлося. Хоць галава была паранена, малады чалавек сам выплыў і, вырашыўшы, што на сёння экстрыму ўжо хопіць, застаўся на беразе і гутарыў з сябрамі. А перад ад'ездам захацеў апаласнуцца, каб не так горача было. Зайшоў у возера па калена, нахіліўся зачарпнуць вады... і страціў прытомнасць (відаць, траўма галавы аказалася значна сур'ёзней, чым падалося на першы погляд). Захлынуўся. «Хуткая» дапамагчы ўжо не змагла. Гэты выпадак, пра які днямі мне расказалі знаёмыя, толькі адзін з дзясяткаў у сумнай статыстыцы летняга траўматызму.**



### Губіць людзей вада. Саракаградусная

З мая па жнівень галаўным (і галоўным) болем медыкаў становіцца «траўма нырца» — пашкоджанне шыйных пазванкоў ад удару галавой аб дно. Найчасцей за ўсё людзі (як правіла, маладыя хлопцы ва ўзросце ад 13 да 30 гадоў) атрымліваюць яе на мелкаводдзі. Больш за 90 працэнтаў гора-нырцоў рашаюцца на экстрым у стане алкагольнага ап'янення.

— Назваць дакладную колькасць людзей, што паступілі за лета з траўмай шыйнага аддзела пазваночніка, складана: лічбы змяняюцца кожны дзень, — кажа **загадчык лабараторыяй траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозга РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй МАЗУРЭНКА**. — Большасць такіх пацыентаў застаюцца інвалідамі ці паміраюць, не даехаўшы да бальніцы.

А тых, каму пашанцавала выжыць, чакае доўгі рэабілітацыйны перыяд (каля трох месяцаў), падчас якога на працу і актыўны адпачынак, зразумела, давядзецца забыцца.

Сёлета, трэба сказаць, лічбы патанулых меншыя, чым летась. Халадноваты пачатак лета на чэрвць зменшыў колькасць няшчасных выпадкаў на вадзе. Калі за паўгоддзе 2014-га ў адкрытых вадаёмах загінула 150 чалавек, то за аналагічны перыяд 2015-га — 113. Выключэннем стала толькі Гомельшчына, дзе стаяла найбольш гарачае надвор'е: там колькасць утапленняў павялічылася ўдвая.

### Зламаны трактар да бальніцы давядзе

Яшчэ адна распаўсюджаная прычына летніх траўм — неасцярожнасць падчас сельскагаспадарчых работ. Па словах **вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі траўматалогіі дарослага ўзросту РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Алега КОРЗУНА**, пашкоджанні людзі атрымліваюць не на працы ў калгасах, а наводзячы парадак на ўласных падворках. Карыстаюцца няспраўнымі трактарамі і касілкамі, не прытрымліваюцца правілаў бяспекі, а потым апынаюцца ў траўмапунктах.

А вось веласіпедысты, якіх ултэку на гарадскіх і вясковых дарогах значна большае, да медыкаў па дапамогу звяртаюцца нячаста. Лёгкая чэрапна-мазгавая траўма, шматлікія ўдары і сінякі — так выглядае сярэднестатычны дыягназ кіроўцы двухколавага транспарту, які не ўтрымаўся ў сядле. Большасць пацыентаў — не тыя, хто павольна круціць педалі ўздоўж спецыяльнай дарожкі, а аматары веласпорту і экстрэмальных забаў. Добра б яшчэ ўвесці пакаранне, як ў Еўропе, за кіраванне веласіпедам у нецвярозым стане. Лепш будзе і для траўматолагаў, і для саміх кіроўцаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

## ПАД КАНТРОЛЕМ

### Незадэкларавалі больш за 260 тысяч еўра

**У пункце мытнага афармлення «Брэст-Цэнтральны» супрацоўнікі Брэсцкай мытні канфіскавалі больш за 260 тысяч еўра, якія грамадзяне ўвозілі ў краіну з парушэннем парадку перасоўвання наяўных грашовых сродкаў праз мытную граніцу.**

— Падчас кантролю тавараў у пасажыраў цягніка «Варшава — Мінск» у двух жыхароў сталіцы 1971 і 1981 гадоў нараджэння былі знойдзены буйныя сумы незадэкларыванай валюты. Грамадзяне ехалі ў адным купэ і заявілі супрацоўнікам мытні аб адсутнасці тавараў для асабістага карыстання, у тым ліку наяўных грашовых сродкаў, якія падлягаюць дэкларыраванню, — распавялі падрабязнасці ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта. — З мэтай праверкі захавання заканадаўства было прынята рашэнне аб правядзенні мытнага агляду багажу пасажыраў. У выніку ў дарожных сумках была выяўлена ўтоеная ад мытнага кантролю замежная валюта. У 44-гадовага мінчаніна знаходзілася пры сабе звыш 150 тысяч еўра, а 33-гадовы грамадзянін спрабаваў незаконна перамясціць праз мытную граніцу 119 тысяч еўра. Грашовыя сродкі ў памеры, які перавышае ў эквіваленце 10 тысяч долараў ЗША, канфіскаваны мытняй да рашэння суда. У адносінах да ўладальнікаў валюты распачаты адміністрацыйныя працэсы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр СІДАРЭНКА:

■ Разважанні пра сучаснасць

# «НЕ ХОЧАМ СТАЦЬ «ЕЎРАБАЧАННЕМ»... У НАС СВОЙ СТЫЛЬ»

**У чым сакрэт даўгалецця «Славянскага базару», інтарэс да якога штогод толькі павялічваецца? Пра гэта і не толькі «Звязда» папрасіла паразважаць кіраўніка дырэкцыі фестывалю. На гэтай пасадзе Аляксандр Сідарэнка працуе ўжо трэці год. А ў адным з першых інтэрв'ю ён прызнаўся, што калісьці хацеў стаць ваенным, узначальваў сельскі Дом культуры... Сёлета Аляксандр Пятровіч выбраны кіраўніком Сусветнай асацыяцыі фестываляў. З гэтага і пачалася размова.**

***— Аляксандр Пятровіч, да гэтага віцебскі фэст быў і ў FIDOF — Міжнароднай федэрацыі фестывальных арганізацый. Больш за гэта — двойчы быў прызнаны «Найлепшым фестывалем года». Асацыяцыя дае больш магчымасцей?***

— Віцебская дырэкцыя не мела намеру неяк «здрадзіць» FIDOF. Яе заснаваў яшчэ ў 1966 годзе спадар Марэна як некамерцыйную арганізацыю, каб каардынаваць і падтрымліваць праекты. FIDOF яднала мноства фестываляў, конкурсаў. Але пакрысе дзейнасць федэрацыі пачала сыходзіць да мінімуму. А неабходнасць узаемадзеяння паміж фестывалямі заставалася актуальнай. Дарэчы, існуюць некалькі падобных аб'яднанняў. Але ў адрозненне ад FIDOF, у Сусветнай асацыяцыі фестываляў (WAF) іншая мэта. Галоўнае для апошняй — не яднаць вялікую колькасць фестываляў, а падтрымліваць фэсты высокага ўзроўню. І для дырэкцыі «Славянскага базару» гэта стала вызначальным.

***— А як зразумець, ці можа фестываль увайсці ў асацыяцыю? Можа, варта прапісаць адпаведныя крытэрыі?***

— А гэтага, напэўна, і не трэба. Бо статус арганізацыі павінен быць настолькі важным, што з ёй павінны лічыцца і вялікія, і маленькія фестывалі. Падтрымка асацыяцыі дае даволі шырокія перспектывы, і гэта павінна заахвочваць арганізатараў да канкрэтных дзеянняў пры фарміраванні праграмы, запрашэнні ўдзельнікаў і гасцей.

Я маю на ўвазе тое, што на «мясцовага ўзроўню» фэсты не паедуць канкурсанты, якія хочуць стаць вядомымі. Зразумела, яны імкнуцца праехаць на «Базар» або яго партнёрскія фэсты... Усё больш у свеце фестываляў чыста камерцыйнай накіраванасці. Гэта, на мой погляд, паспрыяла таму, што наступіў нейкі перыяд застою фестывальнага руху. І так думаю не толькі я. Пра «камерцыю ад культуры» мы гаварылі ў Віцебску на міжнароднай канферэнцыі.



***— Вельмі цікавая тэма для дыскусіі...***

— Так. Тым больш што яе агучылі нашы калегі з Балгарыі і Ізраіля — курортных краін. Значыць, для іх гэта вялікая праблема на самай справе. Калі фестывалі і працу з маладымі і таленавітымі выканаўцамі ўспрымаюць толькі як сродак дасягнення нейкіх камерцыйных мэт, такі падыход, пагадзіцеся, няправільны. Упэўнены, прыйдзе час, і салідная міжнародная арганізацыя зможа такую з'яву неяк абмежаваць. Ужо, дарэчы, пасыпаліся заяўкі на ўступленне ў рады WAF. Але, бывае, пра нейкі фэст нават немагчыма знайсці падрабязную інфармацыю...

Між іншым, у канкурсантаў пад эгідай нашай асацыяцыі ёсць шанц без усякіх фінансавых унёскаў браць удзел у іншых фэстах. Напрыклад, у Віцебску выступіў удала, калі ласка, прыязджай на іншыя конкурсы...

Віцебск будзе штаб-кватэрай Сусветнай асацыяцыі фестываляў 5 гадоў. Яна месціцца ў сценах дырэкцыі «Славянскага базару». На фасадзе хутка з'явіцца таблічка на трох мовах, а на флагштоку ў амфітэатры сярод іншых вывесім і сцяг з эмблемай асацыяцыі...

***— На «Зорным часе» беларускі ўдзельнік Еўрабачання Тэо даў цікавую падставу для разважанняў. Маўляў, добрыя вакальныя здольнасці павінны быць у «звязцы» з артыстызмам. Каб было прыемна не толькі чуць, але і глядзець на канкурсанта. Вы згодны з такім меркаваннем?***

— Мы лічым галоўнай задачай — грунтоўны адбор канкурсантаў. «Брацца» за імідж пакуль не гатовы. Каб канкурсант выйшаў «у вобразе» перад больш за 6 тысячамі гледачоў амфітэатра, ён сам павінен разумець, чаго ад яго чакаюць... Гэта, вядома, велізарны пласт працы. Ці патрэбна шоу падчас выступлення з сімфанічным аркестрам — у першы дзень фіналу? Як правільна заўважыў міністр культуры, мы ж не хочам стаць «Новай хваляй» ці «Еўрабачаннем». Бо ў нас свой стыль.

А вось дзіцячы конкурс «Базару» сёлета быў вельмі відовішчным, у стылі «quest», з адмыслова падрыхтаваным пластычным і танцавальным суправаджэннем. Мы пайшлі на дадатковыя выдаткі і зрабілі сучасную сцэну з вялікай колькасцю экранаў для кантэнту «video-mapping», з святлівым подыумам, сотнямі светлавых прыбораў.

***— Дарэчы, маленькім гледачам даволі цяжка глядзець конкурс з удзелам «зорачак», які доўжыцца каля трох гадзін. Няма ідэі зрабіць, як на дарослым конкурсе, каб у фінал выходзілі не ўсе? І я асабіста лічу несправядлівым, калі ў дзіцячым конкурсе некаторыя краіны прадстаўляюць па дзве «зорачкі»...***

— Можам у прынцыпе зрабіць канцэрты з антрактам. Не лічу мэтазгодным, каб дзіцячы конкурс праводзіўся па аналогіі з дарослым. А наконт таго, што за Беларусь, Расію і Украіну выступаюць два чалавекі, дык першапачаткова так было. Не выключаю, што могуць быць змены. Калі мы прымаем міжнародны конкурс, напэўна, правільна было б, каб усе юныя таленты мелі роўныя шанцы... У гэтым я з вамі згодны.

Між тым ёсць і такая акалічнасць, як паралельнасць правядзення двух конкурсаў. Складана сачыць з аднолькавай увагай за кожным з іх. А калі дабавіць яшчэ шэраг цікавых мерапрыемстваў на іншых пляцоўках, увогуле можна разгубіцца...

***— Можа, асобна праводзіць дзіцячы «Базар»?***

— Гэта складана ў арганізацыйным плане рэалізаваць. Тым больш, што мы ведаем пра не вельмі паспяховы вопыт на іншых фестывалях. Паўтарацца не варта...

***— Фестывалю ў наступным годзе споўніцца 25 гадоў. Памятаю, у першыя гады вельмі актыўна ў СМІ каментавалі яго назву. Чаму толькі «славянскі»? Ды і «базар» — наогул цюркскае слова. Ці неабходны рэбрэндынг?***

— У любым выпадку нельга «кідацца» назвай, мяняць эмблему... Слова «базар» — інтэрнацыянальнае, зразумелае на многіх мовах свету. Ёсць і фестываль «Базар» у Марселі (Францыя), у якім прымаюць удзел скульптары, мастакі, фатографы, пісьменнікі. Аматараў творчасці і рукадзелля штогод збірае «Яраслаўскі базар» (Расія). А «Усходні базар» у Тайландзе — гэта і фестываль-кірмаш тавараў, сувенірнай прадукцыі знакамітых кампаній, і міжнародны тэлевізійны конкурс эстрадных выканаўцаў. «Славянскі базар у Віцебску» — эксклюзіўны, адметны ў гэтым шэрагу.

Вяртаючыся да тэмы пра Сусветную асацыяцыю фестываляў, магу падкрэсліць: яна пашырае межы і магчымасці. Сёлета 42 краіны ўдзельнічалі, і толькі 13-14 — славянскіх. А тая ж Азія да нас цягнецца і Лацінская Амерыка... І асацыяцыя можа стаць асновай, вакол якой у Віцебску можна арганізаваць найбуйнейшы сусветны фестываль. «Базар» — не межы культуры славянскага свету. Мы ўжо даўно за іх выйшлі. Але, напэўна, самі сябе абмяжоўваем словам «славянскі». У выніку, думаю, для многіх краін гэта — нейкі нябачны бар'ер... Сёлета прадстаўнікі Казахстана перамаглі ў конкурсах. Некаторыя здзіўляліся: казахі вывозяць два Гран-пры. А чаму б і не?

**«У канкурсантаў пад эгідай нашай асацыяцыі ёсць шанц без усякіх фінансавых унёскаў браць удзел у іншых фэстах. Напрыклад, у Віцебску выступіў удала, калі ласка, прыязджай на іншыя конкурсы...»**

А новыя праекты фестывалю — доказ таго, што ён не стаіць на месцы. Праект вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» атрымаў добры рэзананс. Разнастайнасць выставачнай праграмы. Так, і да будучага фестывалю рыхтуем новыя цікавыя ідэі!

***— Кіраўнік дзяржавы на цырымоніі закрыцця «Славянскага базару» параўноўваў яго з Алімпіядай. Адзначыў і тое, што фестываль імкнецца да самаакупнасці. Пра канкрэтныя лічбы яшчэ гаварыць рана?***

— Вынікі дакладныя будуць вядомы ў верасні. На сёння магу сказаць, што 90% складаюць пазабюджэтныя сродкі. Мы ўсё заробленае акумулюем на рахунку фестывалю... Няма аналагічных фэстаў у Беларусі і суседніх краінах, каб амаль усе квіткі прадаваліся. Нагадаю, сёлета пачалі іх продаж яшчэ ў сакавіку.

***— Аляксандр Пятровіч, не магу не запытацца пра наступнае. У вас не баліць душа, што ў найбліжэйшыя тыдні ў амфітэатры не будзе канцэртаў?***

— Супрацоўнікі ў адпачынку пасля фестывальнага марафону. Яны яго заслужылі, бо сыходзілі падчас «Базару» дамоў, каб літаральна толькі паспаць, а некаторыя не мелі і такой магчымасці. У верасні пройдуць канцэрты для школьнікаў. Не выключаюцца і выступленні гуртоў. Такі вопыт у нас ужо напрацаваны. І позняй восенню гучала музыка. Я, напрыклад, магу ўзгадаць пра Макарэвіча і яго калектыў...

***— Ці рэальна ўбачыць амфітэатр са сценамі?***

— З'явіўся ж калісьці дах. Зараз пакажу вам паперы... Вось еўрапейская фірма можа «закрыць» лёгкімі канструкцыямі любую залу. І гэта параўнальна нядорага. Не выключаю такой магчымасці.

***— А ці будзе рэалізаваны план па стварэнні комплексу адпачынку ля амфітэатра?***

— Спачатку, думаю, можна паспрабаваць «зрабіць рабочымі» памяшканні ля падземнага перахода да комплексу амфітэатра. Там калісьці працавалі забаўляльны клуб, рэстаран... Я ўжо абмяркоўваў з кіраўніцтвам горада ідэю стварэння комплексу залаў для заняткаў танцавальных калектываў. У цэнтры культуры гэта самыя запатрабаваныя творчыя аб'яднанні, а абсталяваных памяшканняў для заняткаў не хапае. Гэта патрэбна ў тым ліку і для таго, каб рыхтаваць новыя таленты для харэаграфічных фестываляў, якіх у Віцебску ладзіцца некалькі. Самы знакаміты з іх — Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, аўтар ідэі і канцэпцыі якога — мая намесніца Марына Раманоўская...

***— Раскажыце, калі ласка, пра вашу сям'ю, хобі.***

— Жонка па адукацыі настаўніца хіміі і біялогіі. Скончыла ўніверсітэт з адзнакай. Працуе зараз выхавацелькай у дзіцячым садку ў пасёлку Лужасна, дзе мы жывём. Туды ходзяць нашы дзве дачкі. Адной 5 гадоў, другой — 3,5. Мне спакайней, калі жонка побач з дзецьмі. Дочкі — таленты. Яны могуць спяваць нават на англійскай мове. Памяць фенаменальная, асабліва ў старэйшай. Яна прыслухваецца да песні, якая гучыць з прыёмніка, адразу напявае. Адночы было смешна: спрабавала капіраваць Лепса ахрыплым голасам.

Дзеці ходзяць у дзіцячую падрыхтоўчую групу ансамбля «Гарэза» цэнтра культуры «Віцебск». Ужо выходзілі на сцэну падчас канцэртаў. Дарэчы, і жонка была салісткай у танцавальным калектыве.

Наконт хобі, у вольны час для мяне радасць — гэта рыбалка і паляванне. А з нядаўняга часу займаюся і падводным паляваннем. Які ж рыбак не хацеў бы зазірнуць у глыбіню? Ловіш з берага, а хочацца ж ведаць, што там пад вадой...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
**Фота з архіва фестывалю**

# ВЯСКОВЫ КАРНАВАЛ ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ



**У Полацкім раёне прайшоў велакарнавал «Лета ў разгары — круці педалі». У ім бралі ўдзел больш за 50 аматараў катацца на веласіпедах розных узростаў.**

— Незвычайнае мерапрыемства адбылося ў вёсцы Фарынава. Журы выбрала пераможцаў у намінацыях: «За нацыянальны каларыт», «Найлепшы дзіцячы веласіпед», «Экавеласіпед», «Веласіпед-казка»... — паведаміла «Звяздзе» **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама**.

У выніку былі адзначаны хлопчык у вобразе індзейца, сямейны экіпаж, нявеста на ровары... Дыплом атрымала і самая юная 5-гадовая ўдзельніца карнавалу, таксама падзякавалі камандзе ветэранаў.

Потым правялі конкурсы паядання на хуткасць клёцак, лоўлі карасёў, «Залаты голас Фарынава», «Смачныя аладкі ад любімай бабулі», працавала «Акадэмія творчасці»... Майстры на вачах гледачоў выразалі фігуры з дрэва. Усе ахвотныя змаглі атрымаць урокі танцаў. Прэзентавалі лагатып вёскі, які ў перспектыве будзе выкарыстоўвацца ў якасці турыстычнага брэнда.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*



# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЖНІЎНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15774)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Руслан АЛЯХНО:

# «Пра сябе трэба нагадваць. Але не надакучаць»



**У яго жыцці было шмат конкурсаў і фестываляў. Але сапраўдны кар'ерны ўзлёт пачаўся пасля перамогі ў расійскім праекце «Народны артыст-2». Ён пераехаў у суседнюю краіну і пачаў па-сапраўднаму рэалізоўвацца ў творчасці. Запісы альбомаў, здымкі кліпаў, новыя праекты... У 2008 годзе прадстаўляў Беларусь на конкурсе «Еўрабачанне». Летась запісаў дуэт і зняў відэа на песню «Сэрца са шкла» з расійскай спявачкай Валерыяй, чым не толькі парадаваў прыхільнікаў, але і ў чарговы раз даказаў сабе, што любая мара можа стаць рэальнасцю, калі працаваць над сабой. Сёлета Руслан Аляхно перамог у трэцім сезоне шоу пераўвасабленняў «Адзін у адзін», прадставіўшы публіцы вобразы шматлікіх вядомых артыстаў мінулага і сучаснасці. Сустрэўшы артыста на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску», мы пацікавіліся, як яму ўдаецца заставацца сабой у расійскім шоу-бізнесе, ці адчувае ён настальгію па Беларусі і як ставіцца да ўласнай публічнасці...**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Бачыць мэту!

Андрэй БЕЛЯКОЎ:

## «ДЛЯ САЮЗА МОЛАДЗІ ВАЖНА БЫЦЬ У ТРЭНДЗЕ»



Фота БЕЛТА.

**«Год моладзі — каласальная для нас адказнасць, бо моладзь не церпіць фальшы і падману. І калі мы заявілі, што БРСМ павінен аб'ядноўваць креатыўных і цікавых маладых людзей, то павінны гэта рабіць. За свае словы трэба несці адказнасць», — заявіў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.**

**Маладзёжны лідар лічыць, што даваць ацэнку Году моладзі — рана, бо наперадзе яшчэ шмат цікавых і значных падзей, у тым ліку выбары кіраўніка дзяржавы.**

### БЫВАЙ, ІНФАНТЫЛІЗМ!

— Для моладзі гэта ў пэўнай ступені экзамен на сталасць. Яна не можа заставацца ў баку ад важных падзей, таму што сёння мы вызначаем, як будзем жыць далей, як будуць жыць нашы дзеці, як будзе развівацца дзяржава. І тут маладыя павінны быць у авангардзе, — падкрэсліў Андрэй Белякоў. — Саюз моладзі прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх выбарчых кампаніях. Мы пастараемся, каб актывісты БРСМ, па магчымасці, прысутнічалі ў якасці назіральнікаў на ўсіх выбарчых участках. Гэта важна для пашырэння кругагляду, бо ўдзел у такой важнай палітычнай кампаніі — гэта яшчэ і магчымасць стасункаў, зносін з рознымі людзьмі, у тым ліку з замежнымі назіральнікамі, што, у сваю чаргу, можна назваць і моўнай стажыроўкай.

На думку кіраўніка грамадскай маладзёжнай арганізацыі, самае важнае, чаму навучыць моладзь удзел у выбарчай кампаніі, — гэта адказнасць. Маладыя людзі павінны разумець адказнасць за лёс сваёй краіны. Яны не павінны быць інфантыльнымі, у іх павінен быць стрыжань. Важна разумець, што краіну, у якой яны жывуць, трэба берагчы і развіваць.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Карысны досвед

## ПЕДАГОГАМ МОЖАШ ТЫ НЕ БЫЦЬ...

### або Як студэнту трапіць у «НЛА»

**Летам нямала моладзі накіроўваецца ў дзіцячыя лагеры. Не ў якасці адпачываючых, вядома, а ў складзе педагагічных студэнцкіх атрадаў. Выключэнне з правіла — атрад «НЛА», у якім працуюць і навучэнцы непедагагічных спецыяльнасцей.**

### Відаць здалёк

Дзіцячы лагер «Арляня» знаходзіцца ў пары кіламетраў ад Бешанковічаў. Менавіта тут нядаўна распачалася абласная «Лідар-змена». У летнік з'ехаліся 79 старшых школьнікаў з усёй Віцебшчыны. Гэта ў першую чаргу актывісты пярвічных ячэек БРСМ, частыя ўдзельнікі пазашкольных мерапрыемстваў. Працуюць з імі дзесяць студэнтаў, якія і складаюць педатрад «НЛА». Абрэвіятура, дарэчы, расшыфроўваецца як «новы лідарскі атрад».

...Мы прыязджаем у летнік у самы разгар дня — лясную цішыню ўвесь час перарываюць дзіцячыя смех і гоман. Нехта знайшоў сабе занятак на спартыўнай пляцоўцы і гуляе з мячом, іншыя хаваюцца ад спёкі пад дахамі карпусоў. Відаць здалёк і юных выхавацеляў — важатых лёгка адрозніць па фірменных сініх майках з надпісам «НЛА» і жоўтых гальштуках. Нас сустракае **камісар педатрада Анастасія ЯЛЕНСКАЯ.**

— Штогод «НЛА» праводзіць адну «Лідар-змену», — распавядае дзяўчына. — Сёлета сюды ў якасці выхавацеляў трапілі студэнты тэхналагічных спецыяльнасцей, будучыя экскурсаводы, праграмісты і іншыя. Ёсць і чатыры будучыя педагогі. Усе, акрамя аднаго важатага, самі раней адпачывалі на лідарскай змене, нават неаднойчы, таму яны добра ведаюць сістэму знутры. Да таго ж перад выездам у лагер усе праходзяць адпаведную падрыхтоўку. Мы самі складалі праграму заняткаў і мерапрыемстваў, і ўсе даскание ведаюць. Безумоўна, не абыходзіцца і без профільнай педагагічнай падрыхтоўкі: кожнага важатага папярэдне вучаць, як працаваць з дзецьмі, бо гэта зусім няпроста...

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Анастасія Яленская, Кацярына Варушкіна і Алег Палонскі: без гумару ў лагеры нікуды!

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 08 2015 г.

# «ДЛЯ САЮЗА МОЛАДЗІ ВАЖНА БЫЦЬ У ТРЭНДЗЕ»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Так, сёння ёсць магчымасць з'ехаць за мяжу, але ўзнікае пытанне: ці патрэбен ты там? Ці не жадаюць выкарыстаць цябе, як працоўную сілу, а потым выкінуць, як смецце? Важна зразумець, што трэба развіваць краіну, дзе жылі нашы продкі, — падзяліўся сваім меркаваннем Андрэй Белякоў. — Ёсць прыклад, пра які нельга не згадаць. Гэта прыклад Украіны, нашай брацкай славянскай краіны, з якой мы ў рамках маладзёжнага абмену пастаянна мелі стасункі. Сёння гэты абмен спыніўся. Якія каштоўнасці там навязваюцца, чаму моладзь, з якой яшчэ ўчора мы сябравалі і разам развівалі праекты, адмовілася ад гэтага, — вялікае пытанне.

## ЕСЦЬ ПАЗІЦЫЯ? ЗАЯВІ...

Нядаўна БРСМ запусціў новы праект «Выбірай.by!». Адкрытыя дэбаты з'яўляюцца па сутнасці новым этапам «Адкрытага дыялогу», падчас якога моладзь мае магчымасць за «круглым сталом» абмеркаваць розныя пытанні і праблемы. Адна з задач праекта — навучыць маладых людзей аргументаваць свой пункт погляду, адстойваць сваю пазіцыю. У той жа час з дапамогай праекта моладзь зможа атрымаць велізарную колькасць інфармацыі, паколькі дэбаты не зацыкліваюцца на адной тэме.

— Мы прапанавалі больш за 30 тэм, якія тычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, грамадска-палітычных падзей, культурна-забаўляльных мерапрыемстваў, студатрадаўскага руху, развіцця розных маладзёжных ініцыятываў і гэтак далей, — паведаміў Андрэй Белякоў. — Немалаважна і тое, што ў дэбатах прымуць удзел эксперты. Гэта людзі, якія шмат чаго дамагліся ў сваёй кар'еры, якія могуць чамусьці навучыць, могуць даць ацэнку. Бо мэтай дэбатаў з'яўляецца не спрэчка, а ўменне даказаць свой пункт гледжання, выслухаць апанентаў, экспертаў, зрабіць высновы і зразумець свае памылкі. Каб дасягаць вялікіх мэт, развівацца, вельмі важна аб'ядноўвацца. Гэты праект, безумоўна, не скончыцца ў дзень выбараў. Мы плануем, што ён будзе паўсюдны і пройдзе на ўсіх узроўнях. Дарэчы, адзін са слоганаў дэбатаў — «Узброены інфармацыяй — значыць, карысны». Важна разумець, што праз засваенне новай інфармацыі можна прыносіць карысць: сабе, сваёй сям'і, сваму населенаму пункту, сваёй краіне.



Маладзёжны лідар бачыць пэўны сімвалізм у тым, што Год моладзі супаў з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, бо адна з граняў працы БРСМ — гэта захаванне пераемнасці. На з'ездзе арганізацыі, які прайшоў у студзені, быў дадзены старт праекту «Кветкі Вялікай Перамогі»:

— Нам было вельмі прыемна назіраць, як тысячы беларусаў 9 Мая і на Дзень Незалежнасці прымацоўвалі да сваёй вопраткі чырвона-зялёныя стужкі з яблыневай кветкай. Гэты сімвал аб'яднаў людзей усіх пакаленняў.

## ПРЫВІЛЕІ ДЛЯ СТУДАТРАДАЎ

Зараз у самым разгары трэці працоўны семестр. Андрэй Белякоў з задавальненнем адзначыў, што студатрадаўскі рух падтрымліваецца на самым высокім узроўні. Кіраўнік дзяржавы, урад, выканаўчая ўлада на месцах выступаюць як адзіная каманда па яго развіцці. Сёння малады чалавек у любы час года можа запісацца ў студэнцкі атрад і працаваць у вольны ад вучобы час, а гэта ў тым ліку і вызваленне ад падаходнага падатку.




**«Мы запусцілі інтэрнэт-праект «Мая Беларусь — мой выбар». Задача — напоўніць сацыяльныя сеткі пазітыўнай інфармацыяй, фактамі, якія дапамогуць гаварыць з гонарам пра краіну».**

БРСМ ініцыяваў увядзенне падатковых паслабленняў для наймальнікаў студэнцкіх атрадаў, але гэтая ініцыятыва выклікае спрэчкі і рознагалоссе.

— Мне б вельмі хацелася, каб у гэтым годзе сітуацыя, нарэшце, вырашылася, — прызнаўся Андрэй Белякоў. — Сапраўды, прапрацоўваецца заканадаўчы акт, каб матываваць прадпрыемствы і арганізацыі, якія прымаюць студэнцкія атрады. Ёсць прапанова, каб частка падаткаў, якія сёння выплачваюцца ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва наймальнікамі, ішла на фінансаванне базы для ўмацавання студатрадаўскага руху на прадпрыемствах і ў фонды развіцця студэнцкіх атрадаў увогуле. Мы б вельмі хацелі, каб сёлета наша ініцыятыва запрацавала. У Расіі практыка вызвалення наймальнікаў ад падаткаў і іх выплата не ў Фонд сацыяльнай абароны, а на развіццё студэнцкіх атрадаў, існуюць ужо некалькі гадоў. У гэтым выпадку мы не вынаходзілі веласіпед. Мы проста жадаем, каб студатрадаўскі рух развіваўся.

У 2014 годзе больш як 70 тысяч чалавек былі задзейнічаны ў працы студэнцкіх атрадаў. Трэба дабавіць сюды таксама ўдзельнікаў добраахвотніцкіх атрадаў, і атрымаецца, што больш як 130 тысяч маладых людзей былі ахоплены летась падобнай формай занятасці. У гэтым годзе пастаўлена задача, як мінімум, не апусціць гэтую планку.

## ЗАРОБАК — НЕ ГАЛОЎНАЕ...

Андрэй Белякоў расказаў, што на ўсебеларускай маладзёжнай будоўлі БелАЭС студатрады працуюць ужо другі год. Летась там працавалі толькі 209 байцоў студатрадаў, а сёлета іх ужо больш за 400 чалавек. Гэта 20 беларускіх лінейных атрадаў і 3 атрады студэнтаў з Расіі. Сёння будоўля на БелАЭС — гэта прыклад таго, як можна не проста разам працаваць, а яшчэ і сябраваць у рамках Саюзнай дзяржавы.

— Гэта толькі адзін з аспектаў важнасці студатрадаўскага руху. Мяркую, што ў яго цудоўная будучыня. Мы ўпэўнены: у студэнцкіх атрадах фарміруюцца такія важныя якасці маладых людзей, як прыстойнасць і адказнасць, — падкрэсліў кіраўнік Саюза моладзі. — Я не хацеў бы зводзіць карысць працы ў студатрадах выключна да заробатнай платы, паколькі студэнцкі атрад для нас — гэта калектыў, гэта песні ля вогнішча, гэта новыя сябры, гэта ў тым ліку і першае каханне, а потым і сем'і, якія ўтвараюцца пасля таго, як маладыя людзі разам папрацавалі ў атрадзе. Ідэалагічны складнік для БРСМ не менш важны, чым заробак. Мы, натуральна, хацелі б, каб заробак студатрадаўцаў быў большым. Але выдатна разумеем, што з аб'ектыўных прычын сацыяльна-эканамічнага развіцця зарплата байца студатрада не можа быць у шмат разоў большай, чым заробак працоўнага або служачага. Вядома, прэферэнцыі ад дзяржавы дапамагаюць зарабляць больш. Напрыклад, байцы студатрадаў на некаторых буйных будоўлях атрымаюць па 15-18 мільёнаў рублёў. Я хачу звярнуць увагу, што гэтыя лічбы нельга вырываць з кантэксту і казаць, што мы абяцаем адно, а ў рэчаіснасці аказваецца іншае. Шмат залежыць ад таго, якая праца выконваецца, а таксама ад кваліфікацыі студэнта. Меркаванне пра тое, што ў атрады прыходзяць студэнты, якія нічога не ўмеюць рабіць, памылковае. На многія будоўлі прыязджаюць сапраўдныя спецыялісты, муляры і бетоншчыкі з разрадамі. Натуральна, яны зарабляюць больш. Наогул, самыя высокія заробкі якраз у будаўнічых студэнцкіх атрадах. У педагагічных, вядома, зарабляюць менш, але ж гэта зусім іншая спецыфіка працы. Хлопцы і дзяўчаты ідуць у студатрады з рознымі мэтамі — набыць прафесію, завесці сяброў, паглядзець іншую краіну. Напрыклад, сёлета наш валанцёрскі атрад выехаў у Італію, былі паездкі ў Польшчу. Вымяраць усё толькі заробкам нельга. А наогул, будзе развівацца наша дзяржава — будуць павышацца і заробкі студатрадаўцаў.




## РУХ... У IT-КІРУНКУ

Андрэй Белякоў расказаў, што сёлета БРСМ пачаў актыўна практыкаваць два новыя профілі студэнцкіх атрадаў — медыцынскі і навукова-вытворчы. Іх узнікненне ідзе ад жыцця. Стварэнне медыцынскіх атрадаў ініцыявалі студэнты медыцынскіх ВНУ, у прыватнасці з Віцебска. Іх ідэю падтрымалі і гамяльчане. У вольны ад вучобы час многія з іх працуюць, у тым ліку ў службе хуткай дапамогі. Ініцыятыва студэнтаў знайшла падтрымку з боку міністра аховы здароўя, і з нядаўняга часу такія атрады ўжо дзейнічаюць у медыцынскіх установах.

Профіляў студэнцкіх атрадаў раней было пяць — сельскагаспадарчыя, будаўнічыя, педагагічныя, экалагічныя і сэрвісныя. А які з іх па сваіх функцыях падыходзіць для працы, напрыклад, у Акадэміі навук? Вось і было прапанавана вылучыць новы профіль — навукова-вытворчыя брыгады. Не выключана, што з часам з'явяцца і іншыя. Ужо цяпер ёсць прапанова вылучыць у асобны профіль IT-кірунак. З кожным годам усё больш моладзі працуе ў дадзенай сферы.

— Калі гэта будзе сапраўды неабходна, мы збяромся і ў Рэспубліканскім штабе БРСМ, прымем адпаведнае рашэнне, — паабяцаў Андрэй Белякоў. — Для нас самае важнае, каб новыя напрамкі былі запатрабаваны маладымі людзьмі. Мы развіваем толькі тое, што трэба моладзі і дзяржаве. Навошта займацца тым, у чым няма неабходнасці?

## ІНТЭРНЭТУ — РЭСПЕКТ!

Андрэй Белякоў лічыць сацыяльныя сеткі вельмі важным інструментам для рэалізацыі ініцыятыў Саюза моладзі:

— Як сведчаць апытанні, большую частку інфармацыі моладзь чэрпае менавіта з інтэрнэту. Нават тэлебачанне прайграе сецціву, не кажучы пра радыё і газеты. Гэта даніна часу. Зусім нядаўна мы праводзілі апытанне сярод нашых лідараў і ідэалагічных работнікаў. Высветлілася, што без камп'ютараў не могуць абысціся 99% апытаных, без мабільнага тэлефона — 98%, у той жа час без друкаваных СМІ — толькі 32%, а без тэлебачання — 46%. Мы не можам ігнараваць інтэрнэт. Праца гэтая планавая, сістэмная, мы актыўна працуем ва ўсіх буйных сацыяльных сетках. Толькі «ВКонтакте» створана больш за 340 нашых груп, якія аб'ядноўваюць звыш 400 тысяч маладых людзей. БРСМ прадстаўлен таксама ў Facebook, Twitter, Instagram. Мы разумеем, што інтэрнэт можа мець як станоўчае значэнне для развіцця маладога чалавека (даносіць патрэбнае, выступаць сродкам для стасункаў), так і ўяўляць велізарную пагрозу, таму што інфармацыя можа быць розная. Зараз мы запусцілі інтэрнэт-праект «Мая Беларусь — мой выбар». Задача — напоўніць сацыяльныя сеткі пазітыўнай інфармацыяй, фактамі, якія дапамогуць гаварыць з гонарам пра краіну, распавесці пра нашых спартсменаў, алімпійскіх чэмпіёнаў, IT-шнікаў, акадэмікаў, бізнесменаў, якія дамагаюцца поспехаў далёка за межамі Беларусі. Такой інфармацыі ў інтэрнэце не хапае. Нам бы хацелася, каб гэта рабілася ад душы, а не па ўказцы. Каб мы самі разумелі важнасць гэтага працэсу. Бо сёння сецівам карыстаемся мы, а заўтра ў інтэрнэт зойдуць нашы дзеці. Тое, што яны адкрыюць, што яны там убачаць, сфарміруе іх псіхалогію, характар і свядомасць.

Праз інтэрнэт мы спрабуем данесці цікавую інфармацыю аб нашым саюзе. Зразумела, што віртуальная прастора ў будучыні будзе выкарыстоўвацца вельмі актыўна самымі рознымі структурамі і арганізацыямі, там жа пастаянна з'яўляюцца новыя тэндэнцыі, прасочваецца пэўная мода на нейкія рэчы. І для БРСМ важна пастаянна быць у трэндзе, у тым ліку ў інтэрнэце. Расказаць нам ёсць пра што, у саюзе, дарэчы, кожны малады чалавек па-свойму таленавіты і крэатыўны. І са свайго боку мы будзем рабіць усё для таго, каб інтэрнэт быў пазітыўны.

## «КАЗЫРНАЯ КАРТА»

Кіраўнік Саюза моладзі расказаў пра адзін з пілотных праектаў арганізацыі.

— Асэнсоўваючы сусветны вопыт, мы ўжо распрацавалі і ў найбліжэйшы час запусцім спецыяльны маладзёжны білет у выглядзе карты. На ёй будуць знаходзіцца і асабістыя даныя, і іншыя звесткі. Карта дасць магчымасць скарыстацца дысконтнай праграмай не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і сумежных дзяржаў, у прыватнасці ў Расійскай Федэрацыі. Мы зараз прапрацоўваем гэтае пытанне з нашымі партнёрамі. У дадатку да карты будзе знаходзіцца брашура з указаннем адрасоў падтрымкі. Зусім хутка, думаю, адбудзецца прэзентацыя першай партыі такіх маладзёжных білетаў. Адной са сваіх задач БРСМ бачыць падтрымку сваіх жа членаў. І гэтая маладзёжная карта, па сутнасці, паслужыць яшчэ адным інструментам для падтрымкі маладых людзей. Плюс — гэта стыльна, прыгожа, зручна, сучасна.

Андрэй Белякоў раскрыў яшчэ адзін сакрэт: зараз БРСМ працуе над тым, каб стварыць спецыяльную карту і для ўдзельнікаў праекта «100 ідэй для Беларусі». Гэта будзе ў пэўным сэнсе клуб у рамках праекта, а ўладальнікі клубных карт будуць мець дадатковыя бонусы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

IT-тэхналогіі

# ВЫБРАЦЬ ТАВАР У ІНТЭРНЭЦЕ – ПРОСТА...

**Падведзены вынікі міжнароднага конкурсу маладых распрацоўшчыкаў, праграмістаў і стартапераў «Тэлекам Ідэя». Усяго з больш чым 300 заявак у заключную частку конкурсу прайшло 35 праектаў, распрацаваных студэнтамі, маладымі навукоўцамі, навуковымі калектывамі і прадпрымальнікамі-пачаткоўцамі з СНД. Беларусь была прадстаўлена ў фінале сямю камандамі.**

Сярод пераможцаў аказаліся два беларускія праекты. Беларускі стартап Meritale у гэтым годзе выйграе ўсе конкурсы запар. У маі хлопцы сталі прызёрамі Хакатона БДУ, у чэрвені ўзялі нацыянальную прэмію Belarus Startup 2015, а ў ліпені перамаглі ў Міжнародным конкурсе «Тэлекам Ідэя — 2015» (намінацыя «RETAILTech»). Што ж прыдумала маладая каманда з Мінска?

Meritale (www.meritale.com) — гэта сэрвіс па зборы і апрацоўцы водгукаў, які спрашчае выбар тавараў у інтэрнэце. З дапамогай спецыяльных алгарытмаў ён здольны адлюстраваць на адной старонцы меркаванне ўсяго інтэрнэту аб любым тавары і сэканоміць такім чынам час патэнцыйнага пакупніка. Галоўнай узнагародай для аўтараў стартапа пасля перамогі ў Маскве стала запрашэнне ў інавацыйны адукацыйны тур у Ізраіль. Акрамя гэтага, каманда атрымала права прадставіць свой праект на разгляд экспертаў МТС і партнёраў. Зараз ён праходзіць закрытае тэсціраванне. А ўвосень гэтага года каманда плануе выхад на рынак і першыя продажы.

А сэрвіс для выбару і планавання анлайн-навучання PUSHka, таксама распрацаваны ў Мінску, быў адзначаны спецыяльным прызам ад расійскай Вышэйшай школы маркетынгу і развіцця бізнесу. Аўтары праекта заручыліся пажыццёвай неабмежаванай падтрымкай з боку ментараў.

Сярод пераможцаў фіналу — сістэма спадарожнікавай сувязі Yaliny, камп'ютарны інтэрфейс для пацыентаў, якія не могуць рухацца, «Медхелпер», «экалагічны» мабільны дадатак «Вырасці сваё дрэва», платформа для самастойнага стварэння інтэрактыўнага кросплатформеннага мультыэкраннага адукацыйнага кантэнту Edugame Creator, мабільны дадатак Cardberry для зручнага выкарыстання дысконтных карт, платформа для аддаленай ідэнтыфікацыі дакументаў, якія сведчаць асобу, CheckU і мабільны дадатак «Персанальная сістэма камерцыйнага ўліку электраэнергіі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Справы маладых

# Пра экалогію — друкаваным радком

## ЯК ГІМНАЗІСТЫ ВЫПУСКАЮЦЬ СВОЙ ЧАСОПІС

**Упершыню з Іванам ПРЫШЧЭПАМ мы сустрэліся на абароне праектаў конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Хлопец прадстаўляў увазе журы праект экалагічнага прэс-цэнтра, а ў якасці прыкладу прыводзіў часопіс «ecoGymn», які ён разам з сябрамі выдае ў сталічнай гімназіі №19. Першае, што кінулася ў вочы, — незвычайная тэматыка, а таксама бездакорнае візуальнае афармленне вучнёўскага СМІ. Таму мы яшчэ раз запрасілі хлопца на размову і распыталі яго пра асаблівасці працы школьнага рэдактара.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Раней наша школа мела экалагічны ўхіл, — распавядае Іван. — Але і цяпер, калі яна стала гімназіяй, настаўнікі і адміністрацыя надаюць шмат увагі выхаванню вучняў у гэтай сферы. Сярод шматлікіх экапраектаў не хапала такога, які перыядычна рабілі б самі школьнікі. Гады два таму мы вырашылі выпускаць свой часопіс. Па-першае, ён павінен быў стаць пляцоўкай для стасункаў і сумеснай творчасці вучняў, а па-другое, мог адыграць і прафарыентацыйную ролю, бо выдавецкая дзейнасць — гэта не толькі журналістыка, а яшчэ і дызайн, фатаграфія, менеджмент. Дарэчы, сёлета некаторыя аўтары нашага часопіса паступалі ў інстытут журналістыкі БДУ. Я стаў галоўным рэдактарам, сабраў каманду, і мы пачалі працаваць.

Напачатку найбольшай цяжкасцю было для нас напаўненне нумара, але з цягам часу выпрацавалі пэўную канцэпцыю (гімназічны часопіс пра экалогію), і праца пайшла шпарчэй. Яшчэ хацелася, каб гэта было прыгожа — не чорна-белая газета, раздрукаваная на прынтары, а каляровы часопіс на добрай паперы. З гэтым дапамагла школа, а таксама апякунскі савет. Увогуле, бацькі і настаўнікі вельмі шмат зрабілі для выхаду часопіса, у тым ліку сваімі парадамі. У выніку, я лічу, атрымалася нядрэнна — наш праект быў адабраны для ўдзелу ў рэспубліканскім этапе «100 ідэй для Беларусі».

***— Патлумач, што азначае «гімназічны часопіс пра экалогію»?***

— У першую чаргу гэта выданне пра гімназію для яе навучэнцаў, таму не маглі абыходзіць увагай іх жыццё. Пісалі пра мерапрыемствы, якія праходзілі ў нашай навучальнай установе, друкавалі спісы вучняў, што перамагалі ў алімпіядах і займалі прызавыя месцы на спартыўных спаборніцтвах; былі і спецыяльныя нумары — да Дня настаўніка або дня нараджэння гімназіі. Таму кожны раз, калі выходзіў свежы нумар і я накіроўваўся вешаць яго на стэнд, вакол збіраўся цэлы натоўп хлопцаў і дзяўчат, якія шукалі на старонках сябе. Бацькам таксама было цікава, чым займаюцца іх дзеці, каго з іх адзначаюць...

Другі кірунак — экалагічны. Пісалі пра сусветныя і айчынныя падзеі і мерапрыемствы, напрыклад, пра Сусветны дзень без аўтамабіля. Ну і акцыі, у якіх бралі ўдзел гімназісты сумесна з іншымі арганізацыямі, такімі як «Ахова птушак Бацькаўшчыны» або адукацыйным цэнтрам імя Ёханэса Рау. Разам з першай мы праводзілі назіранне за птушкамі каля «Чыжоўка-Арэны», прыбіралі ў заказніку «Лебядзіны», з другой — праводзілі веласіпедныя парады, адкрывалі ў нашай гімназіі першую экавелапаркоўку. Акрамя таго, заўсёды імкнуліся самі ўзняць нейкія праблемы ў рэдакцыйнай калонцы.

***— Хто працуе над часопісам?***

— Спачатку рэдакцыя складалася з мяне і маіх знаёмых, у якіх была я быў упэўнены. Заўсёды трэба пачынаць з людзей, магчымасці якіх ты ведаеш. Потым яны пачалі прыцягваць сваіх сяброў, якіх новы занятак мог зацікавіць. Так і фарміравалася наша рэдакцыя. Вядома, у першую чаргу яна складалася з вучняў старшых класаў: адзінаццацікласнікі курыравалі малодшых. Многім гэта дапамагло знайсці новых сяброў. Бывала, прыходзіш дадому ў дзесяць вечара і бачыш здзіўленыя вочы бацькоў, калі кажаш, што рабіў у школе часопіс.

***— Як распаўсюджваецца «ecoGymn»?***

— Друкуецца толькі некалькі асобнікаў кожнага нумара: для школьнай бібліятэкі, саміх журналістаў і адміністрацыі. Адзін экзэмпляр мы спецыяльна выводзім пастаронкава, каб павесіць на стэнд і кожны мог яго пабачыць і пачытаць. Таксама ўсе нумары можна знайсці на сайце школы ў электронным выглядзе.

***— Ты ўжо выпускнік. Ці будзе выданне жыць без свайго заснавальніка?***

— Так, я ўжо даўно думаў пра гэта і падрыхтаваў сабе замену *(смяецца)*. Гэта дзяўчына, якая прайшла разам з часопісам «агонь, ваду і медныя трубы». Галоўнае, каб знаходзіліся людзі, якім гэта будзе цікава, у якіх хопіць энтузіязму, каб нешта рабіць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Стварыць, не парушыўшы

**Георгій ЗАБОРСКІ:**

# «СУЧАСНЫ ГОРАД — ГЭТА ЗАКЛІК ДА ДЗЕЙНАСЦІ»

**Чаго хочуць маладыя? Вядома, мяняць да лепшага тое, што яны бачаць. Напрыклад, гарадскую прастору, дзе часам не хапае цікавых месцаў для адпачынку. Мы пагутарылі з маладым архітэктарам і футуролагам, адным з арганізатараў «Мінскага фестывалю ўрбаністыкі» Георгіем ЗАБОРСКІМ пра гэтую ўрбаністыку, яго ўласныя праекты і бачанне развіцця беларускіх гарадоў.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Чаму менавіта архітэктура?***

— Гэта дзіўная добрая гісторыя. Мой дзед быў архітэктарам, а бацька не меў упэўненасці, што жадае ісці па яго шляху. Але так склалася, што спачатку ён усё ж такі стаў архітэктарам і толькі пасля зразумеў, наколькі шчаслівы ў сваёй працы. А без бацькі не было б нічога з таго, што раблю я, бо ён адкрыў у Мінску першую майстэрню, дзе актыўна пачалі наймаць недавучаных студэнтаў — адтуль выйшлі маладыя і смелыя спецыялісты. Я атрымаў такі ж досвед і, прызнаюся, без яго не змог бы стаць архітэктарам.

Я прынцыпова вырашыў не ісці ў архітэктары і збіраўся паступаць на аўтатрактарны, таму што мяне цікавіў аўтадызайн. Аднак пасля дзясятага класа заваліў экзамен па матэматыцы, з прычыны чаго давялося перайсці ў клас політэхнічнага ліцэя, дзе не патрабавалася «лічба» па матэматыцы. Гэта быў архітэктурны клас. Да канца першага курса ўніверсітэта я не разумеў, што я тут раблю: я ж не хацеў сюды. Але пасля мы пачалі самі арганізоўваць адукацыйныя праекты, і тады стала цікава. Акрамя таго, былі выкладчыкі, якія натхнялі. А ўлетку паездзіў у заходнія архітэктурныя школы, дзе збіраліся студэнты і выкладчыкі і разам рабілі неверагодныя праекты. Я ўцягнуўся і пасля аб сваім выбары не пашкадаваў.

***— Пахваліцеся ўласнымі праектамі.***

— Мая студыя робіць новыя формы грамадскай прасторы. Мы называем гэта вынаходствам новых спосабаў быць з сабой альбо быць з іншымі. Гэта ў навінку для Беларусі. Адзін з яркіх праектаў — «Парк з wi-fi». Стварыць новае, нічога не парушаючы, не ссекшы ніводнага дрэва. Выйсці з офіса і папрацаваць у прыродным асяроддзі: нічога больш сучаснага за гэта яшчэ не вынайдзена. Акрамя таго, мы ствараем гібрыды паміж выдатнымі дворыкамі 1950-х, зялёнымі і ізаляванымі, і сучаснымі дварамі, дзе ёсць пляцоўкі для дзяцей і месцы для камунікацыі дарослых. Тут можна і спартыўны фестываль арганізаваць, і дзень нараджэння адзначыць, і кіно паказаць.

***— Зараз моладзь цікавіцца ўрбаністыкай. Як працуюць спецыялісты ў гэтай сферы?***

— Сучасны ўрбаніст думае пра ўзаемасувязь звёнаў гарадской сістэмы. Ён аналізуе, напрыклад, як якасць паветра ў канкрэтным раёне паўплывае на кошт кватэры? На падставе атрыманых вынікаў стварае праекты па паляпшэнні асяроддзя. У Беларусі пакуль немагчыма вывучыцца на ўрбаніста, а ў свеце, у той жа Расіі, ужо ёсць такія спецыяльнасці, існуюць адукацыйныя паслявузаўскія ўстановы, дзе свежаспечанага архітэктара, фізіка ці журналіста перавучваюць у спецыяліста па гарадах.

***— Сярод вашых спецыяльнасцей значыцца адна даволі інтрыгуючая — футуролаг. Улічваючы, што вы архітэктар, ці зможаце прадказаць будучыню горада?***

— Насамрэч, гэта міф. Футуролагі не прадказваюць будучыню, а канструююць яе. Наша роля — бачыць верагоднасці, а пасля адшукаць шлях іх далейшага развіцця. Прывяду прыклад: два гады таму я зразумеў, што ў Мінску будуецца многа панэльнага жылля. З іншага боку, у сталіцы з'яўляецца шмат маладых людзей з дастаткам, якіх яно не надта цікавіць. Я перасёк дзве тэндэнцыі і ўгадаў вынік: можна змяніць асяроддзе і зрабіць прывабнымі дворы, пляцоўкі, паркі. Прыкладна так працуюць футуролагі.

***— Дык якая будучыня чакае Мінск?***

— Ёсць тры магчымыя траекторыі. Згодна з адной з іх, Мінск будзе развівацца абсалютна раўнамерна. Ён прырастае жыхарамі — афіцыйная статыстыка дае лічбу ў 2,5 мільёна чалавек да 2030 года. Горад становіцца больш цесным, адпаведна, у ім больш затораў. Затое атрымае развіццё культура: адмысловыя праекты з'явяцца не толькі ў цэнтры, але і на ўскраінах горада. Адбудзецца падзел па раёнах, кшталту адзін — «цікавы», другі — «бяспечны». Горад ператворыцца з мегаполіса ў асобную краіну.

Другі сцэнарый звязаны з актыўным паляпшэннем гарадскога наваколля. Напрыклад, актуальна прасоўванне альтэрнатыўнай мабільнасці: з'яўленне хуткаснага трамвая, які звяжа паміж сабой раёны. Можна прапанаваць жыхарам перасоўвацца па горадзе на веласіпедах і скутарах. Хаця веласезон доўжыцца паўгода, на гэты час горад моцна мяняецца. Дарэчы, ты становішся гараджанінам у поўным сэнсе гэтага слова, калі сам пачынаеш мяняць горад. Для апошняга, трэцяга, варыянта развіцця характэрна актыўнае супрацоўніцтва грамадскіх ініцыятыў і ўлады.

***— Са сталіцай зразумела. А што скажаце пра невялікія гарады?***

— Я затрымаўся ў Мінску толькі таму, што тут ёсць заклік да дзейнасці, але ў невялікіх гарадках іх значна больш. І ёсць рэсурсы, бо ёсць моладзь. Невялікі горад не цяжэй насыціць цікавым жыццём, чым вялікі. Але вядома, усё адразу не з'явіцца. У Беларусі ёсць прыклад Баранавіч, дзе рэалізуецца праграма па асваенні закінутай прасторы ў цэнтры горада. Там з'яўляюцца цікавыя ініцыятывы — ад турыстычнага цэнтра да маладзёжных кінапраглядаў. Другі фактар — узровень заробкаў. Задача цэнтральнай альбо мясцовай улады ў тым, каб забяспечыць годныя заробкі, развіваць бізнес. Напрыклад, можна прапаноўваць ільготныя ўмовы крэдытавання для бізнесу ў малых гарадах.

Дарэчы, зараз у Беларусі дзейнічаюць некалькі адукацыйных праектаў, скіраваных на тое, каб жыхары малых гарадоў маглі вучыцца менеджменту культуры і ўрбаністыцы. Можна вучыцца ў мінскай «Школе супергерояў». Ёсць «Мінская ўрбаністычная платформа».

***— А якая архітэктурная пабудова ў Беларусі вам найбольш падабаецца?***

— Сынкавіцкая крэпасць-царква — аб'ект, які выразна паказвае, што ў Беларусі ёсць свае асаблівасці. Рысы маналітных шчыльных праваслаўных храмаў і кавалкі гатычных зводаў, наслаенне часоў: яна неаднаразова дабудоўвалася, але пры гэтым не згубіла адметнасці. Акрамя яе, магу назваць цэласную забудову цэнтра Мінска, у прыватнасці месца перасячэння Свіслачы з праспектам Незалежнасці. Шырокія панарамы, прырода, класіка разам з сучаснасцю...

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 08 2015 г.

Экалогія душы

# ЗАМЕСТ ВАРОН ЛЕПШ ЛІЧЫЦЬ... БУСЛОЎ

**Часам навукоўцы мусяць рабіць дзіўныя рэчы. Напрыклад, залазіць на таўсценнае дрэва дзеля птушынага гнязда; праходзіць дзясяткі кіламетраў, добраахвотна прадзіраючыся праз хмызнякі і зараснікі чароту; «пасвіць» рыбу і «карміць» камароў. Здавалася б, такія паводзіны больш пасуюць гарэзам-школьнікам, чым салідным прафесарам. Што ж, школьнікі могуць быць адначасова і навукоўцамі...**



**Аляксей МУХЛЯ, кіраўнік клуба даследчых экспедыцый «Выток» пры Мінскім дзяржаўным турысцка-экалагічным цэнтры дзяцей і моладзі** (на здымку) бывае ў гэтым будынку толькі па неабходнасці: аформіць і падпісаць дакументы, правесці мерапрыемства, выступіць з дакладам ці атрымаць інструктаж. Куды часцей яго можна знайсці на пасяджэннях клуба, якія праводзяцца ў лошыцкіх школах. Менавіта адтуль і шляхі экспедыцый на палескія балоты і азёры Віцебшчыны.

Жыццё клуба пачалося з сумеснага праекта «Школа экспедыцый» Акадэміі навук, гандлёвай маркі «Экспедыцыя» і турысцка-экалагічнага цэнтра. Напачатку былі сумненні, ці змогуць дзеці «пацягнуць» працу вучонага, аднак у 2007 годзе адбыўся першы сумесны паход, які прынёс плён. Цяпер вучні збіраюць матэрыял для будучых дакладаў, дысертацый і міжнародных канферэнцый, а зацікаўлены ў гэтым навуковы свет падтрымлівае экспедыцыі грантамі.

— Усе мы ведаем, якімі «цікавымі» часам бываюць лекцыі, асабліва для дзяцей у 11-12 гадоў, — распавядае Аляксей. — Можна расказваць і многа, і займальна, але калі слухачы спяць, наперадзе ў іх пяць гадзін заняткаў, а ў руках тэлефон з інтэрнэтам, канкурыраваць з гэтым настаўніку надзвычай цяжка. Аднак ні адна тэхналогія не можа перадаць адчуванне, што істота, жывая, знаходзіцца побач. Таму экалагізацыя душы ва ўдзельнікаў клуба адбываецца праз узаемадзеянне з прыродай. Дзеці трымаюць у руках рэдкіх жывёл, бачаць агромністыя дрэвы, жывуць у палатках, сустракаюць узыход сонца над возерам. І адначасова сутыкаюцца з высечкамі і сметнікамі вакол вёсак. Такім чынам яны асэнсоўваюць, наколькі прырода залежыць ад нашых учынкаў, адчуваюць узаемасувязь усяго жывога на зямлі.

Вядома, асноўны крытэрый прыёму у склад экспедыцыі — зацікаўленасць. Аднак пад увагу бяруцца таксама тэарэтычная і фізічная падрыхтоўкі. Тут «Вытоку» дапамагаюць як калегі з турысцка-экалагічнага цэнтра, так і іншыя ўстановы турыстычнага і спартыўнага характару. Даследчык павінен умець усё: вылічваць азімут па компасе, плаваць на байдарцы, рабіць замеры, складваць рэестры і па дзесяць дзён жыць у лесе. Для асабліва падрыхтаваных груп начоўка зімою без палаткі — справа вядомая і магчымая. У падрыхтоўчай групе (а туды прымаюць з 11 гадоў) дзеці вызначаюцца, каму што мілей. Хтосьці адчувае сябе асам за клавіятурай, не нудзіцца работай з паперамі і таму дабывае інфармацыю для дакладчыкаў і сартуе атрыманыя падчас экспедыцый звесткі. «Валацугі» — так у клубе жартам называюць хлопцаў і дзяўчат, якія найхутчэй за ўсіх умеюць раскласці вогнішча, згатаваць вячэру і паставіць палатку. Даследчыкі ж займаюцца асноўнай задачай экспедыцыі: вывучэннем экалогіі.

Пакуль удзельнікі клуба працуюць па трох кірунках. Першы — асенні, у гэты час у Беларусь завітвае з далёкага мора кумжа, альбо інакш — ласось. Тут, у неглыбокіх рачулках, рыба нерасціцца, тут жывуць малькі, пакуль не адпраўляюцца ў адваротнае падарожжа да рачнога вусця. Вядома, «знатную госцю» з марскіх плыняў трэба ахоўваць, чым нараўне з дарослымі займаюцца і школьнікі, а ў дадатак — вывучаюць рэдкую ў нашай мясцовасці папуляцыю рыб.

**«Валацугі» — так у клубе жартам называюць хлопцаў і дзяўчат, якія найхутчэй за ўсіх умеюць раскласці вогнішча, згатаваць вячэру і паставіць палатку.**

Сярэдзіну лета няўрымслівыя даследчыкі сустракаюць у віцебскіх або палескіх лясах з падзорнай трубой і... альпінісцкім рыштункам. Інача немагчыма працаваць па другім кірунку: вывучэнні чорнага бусла. Залезці на дрэва — ужо прыемна. А зняць адтуль цёплае, жывое бусляня, закальцаваць яго і вярнуць на месца — прыемна удвая, бо сваімі рукамі можна патрымаць рэдкую птушку з Чырвонай кнігі і прынесці карысць навуцы. А вясною школьнікі ладзяць гнёзды. Дакладней — сплятаюць аснову з галінак і падымаюць яе на дрэва, каб зацікавіць птушку.

Трэці кірунак экспедыцый — этнаэкалогія. Яе аматары даследуюць, якім чынам суполкі людзей уздзейнічаюць на экалогію і наадварот. Пасля аналізу сабраных звестак маладыя навукоўцы могуць сур'ёзна разважаць пра асабліваці экалагічнага менталітэту беларусаў ці, напрыклад, патлумачыць, чаму дачнікі часцей пакідаюць пасля сябе сметнікі, чым мясцовыя жыхары.



А як жа турысцкая рамантыка? Яе таксама хапае. Тут і выпрабаванне на трываласць, і сапраўднае сяброўства, і песні пад гітару каля начнога вогнішча, і адчуванне сябе частачкай вялікай жывой Зямлі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і з архіва клуба.**

# ПЕДАГОГАМ МОЖАШ ТЫ НЕ БЫЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

## Усю ўладу — дзецям!

Кожны дзень удзельнікаў лідарзмены ў «Арляняці» падзелены на дзве часткі. У першай палове дня ў дзяцей развіваюць менавіта лідарскія якасці, гэта так званая «вучоба актыву». Ім дапамагаюць пазнаваць сябе, вучаць шукаць агульную мову з іншымі і працаваць у камандзе, даюць веды па канфліктлогіі і многае іншае. Бліжэй да вечара надыходзіць час лагерных мерапрыемстваў. За 13 гадоў існавання педатрада склаліся цікавыя традыцыі. Напрыклад, традыцыйную «лінейку» замяніла лідарскае кола: выхаванцы і важатыя змены штодзень становяцца ў кола, у якім спяваюць, дзеляцца навінамі і абмяркоўваюць свае планы. Ёсць яшчэ ранішняя размова і вячэрняя свечка...

Па словах Анастасіі, змена гэтая ўнікальная. Напрыклад, замест сумнай ранішняй зарадкі тут практыкуюць аэробіку: кожны з чатырох лідарскіх атрадаў штодзень прыдумляе заняткі ў стылі танцаў народаў свету. Рэалізавана і шматузроўневая сістэма самакіравання. Узначальвае змену штабцэнтр, які кіруюць важатыя. Найвышэйшы заканадаўча-выканаўчы орган дзяцей — савет атрадаў асобага прызначэння, у які ўваходзяць камандзіры і камісары атрадаў. Апошні ўзровень — групы асобага прызначэння, якіх у кожным атрадзе тры: творчая, арганізацыйная і спартыўна-бытавая. Задача дзяцей — самім ініцыяваць і праводзіць мерапрыемствы, а важатыя іх толькі накіроўваюць.

**Самае папулярнае некалі мерапрыемства — дыскатэка — асаблівай цікавасці не выклікае. Выхаванцы з большым імпэтам спяваюць пад гітару, калі выдаецца вольная хвілінка.**

Кожная «Лідар-змена» мае сваю тэматыку. Сёлетняя — трынаццатая па ліку, таму было вырашана зрабіць яе максімальна загадкавай і даць адпаведную назву — «Цалкам сакрэтна». Важатыя прыдумалі легенду, быццам бы трынаццаць гадоў таму на тэрыторыі лагера адбыўся загадкавы выкід энергіі. Задача дзяцей — пры дапамозе кавалкаў гісторый і шыфраў аднавіць ход падзей і раскрыць сакрэт змены.

## Ні хвіліны без... працы!

А што ж самі важатыя? Пэўна, цяжка ім прыходзіцца з дзецьмі, якія не нашмат маладзейшыя за сваіх выхавацеляў?

**Трэцякурснік факультэта тэлекамунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Алег ПАЛОНСКІ** прымае ўдзел у працы ўніверсітэцкай суполкі БРСМ. Сёлета хлопец збіраўся ехаць працаваць важатым у Расію. Але раптам падвярнуўся варыянт з «НЛА», куды Алег трапіць і не спадзяваўся: па чутках, прэтэндэнтаў чакаў сур'ёзны адбор, звяртаць увагу павінны былі на наяўнасць і педагагічнага досведу. Усё склалася як нельга лепш — у «НЛА» вызвалілася месца і студэнта БДУІР накіравалі ў «Арляня».

— Першапачаткова мяне цікавіла нават не столькі праца з дзецьмі, колькі сама атмасфера. Тут няма калі сядзець на месцы, увесь час трэба нешта рабіць, прыдумляць, а такі рытм жыцця мне даспадобы, — кажа Алег. — Ты вучыш нечаму выхаванцаў і, адпаведна, сам вучышся, без гэтага ніяк. Самымі цяжкімі былі першыя тры дні, бо гэта час, калі з незнаёмых паміж сабой дзяцей трэба сфарміраваць калектыў, наладзіць паміж імі і сабой сувязь. Цяпер не так складана, бо калектывам прасцей кіраваць. Ёсць і цяжкасці, зразумела. Мне падаецца, што раней падлеткі былі больш падобныя адзін да аднаго, мелі блізкія інтарэсы. Цяпер жа — усе вельмі розныя. Магчыма, уплываюць сучасныя медыя — дзеці растуць у свеце з неверагоднай колькасцю інфармацыі, а таму даводзіцца шукаць падыходы да кожнага асобна.

Кажучы пра напружаны рытм працы, Алег не хлусіць. Анастасія пацвярджае, што важатыя кладуцца спаць не раней за тры гадзіны ночы, а ўставаць трэба ў сем раніцы.

**Кацярына ВАРУШКІНА вучыцца на чацвёртым курсе Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў** па спецыяльнасці «Акцёр драматычнага тэатра і кіно». Дзяўчына прызнаецца, што выбрала такую прафесію дзякуючы «Лідар-змене», якая дапамагла ёй пазбавіцца сарамлівасці і раскрыць свае здольнасці.

— Я сапраўды не магу жыць без змены, заўсёды хацела сюды вярнуцца, — кажа яна. — Праца з дзецьмі для мяне не новая: я выкладаю акцёрскае майстэрства і сцэнічнае маўленне ў дзяцей малодшага ўзросту ў гуртку, таму вопыт ёсць. Вядома, тут працаваць трэба ўжо з падлеткамі, але гэта не абцяжарвае. Хоць у нас і не такая вялікая розніца ва ўзросце, але кожны разумее, што важаты — гэта галоўны чалавек у атрадзе. Мы імкнёмся заўсёды быць трохі «вышэй» за выхаванцаў, але не замінаем ім самім прымаць важныя рашэнні.

## Дыскатэка — не ў «фаворы»

Пазнаць будучых лідараў лёгка: адна з груп маршыруе ў сталовую пад гукі нейкай незразумелай песні, разабраць у якой можна толькі... лічбы. Да вушэй даносіцца рытмічнае «сем — адзінаццаць — трынаццаць».

— Гэта назва атрада, — смяецца Анастасія Яленская. — Сем хлопцаў, трынаццаць дзяўчат, а дзве «адзінкі» — гэта важатыя. Калі прыслухаецеся, пачуеце яшчэ і нумары тэлефонаў — гэта кантакты важатых. Мы ўвогуле спачатку думалі скласці песню з тэлефонных нумароў усіх дзяцей у атрадзе, каб яны маглі лёгка адно аднаго знайсці пасля заканчэння змены.

Дзеці тут сапраўды непадобныя да многіх іншых. Самае папулярнае некалі мерапрыемства — дыскатэка — асаблівай цікавасці не выклікае. Выхаванцы з большым імпэтам спяваюць пад гітару.

Якраз да такой «пявучай» групы мы і падыходзім. Юнакі выконваюць песню пра лідарскую змену, своеасаблівы неафіцыяльны гімн, які напісала выхаванка Марыя Юркевіч.

— З «Лідар-зменай» цяжка параўноўваць любы іншы лагер, — кажа **Дар'я ХМЫЛОВА** з Оршы. — Тут ты не толькі адпачываеш, але і вучышся. А яшчэ ніколі не сумуеш, бо на гэта проста не хапае часу. Увесь час трэнінгі, заняткі...

• • •

За адпрацаваную змену юныя важатыя атрымаюць заробак. Гэта сімвалічныя грошы, і ўсе студэнты сыходзяцца ў думцы, што едуць сюды не па яго. Уражанні і сяброўства — вось што галоўнае ў «НЛА».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Мінск — Бешанковіцкі раён — Мінск.*



**Беларускамоўную песню пра «Лідар-змену» выконвае аўтарка — Марыя Юркевіч.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



13 08 2015 г.

Эх, каб яшчэ...

# ПУШЧАНСКІЯ СКАРБЫ,

## або Дастаць «гісторыю» шуфлікам

**Палова на дзявятую раніцы. Разам са старшым выкладчыкам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін БДУ Аляксандрай ЗУЕВАЙ мы мінаем лес і выходзім на адкрытую пляцоўку. На стаянцы каменнага веку «Каменюкі-1», якую раней адносілі да жалезнага веку, ужо ва ўсю кіпіць праца. У неглыбокай, на першы погляд, яме дзяўчаты і хлопцы дастаюць «гісторыю» шуфлікамі.**



У руках Алега Ткачова знаходзіцца нуклеус — рэшткі ад вытворчасці каменных прылад.

### Ці ажыве мінуўшчына?

Раскопкамі ў Белавежскай пушчы займаюцца даўно: першыя даследаванні праводзіліся падчас Першай сусветнай вайны. Пасля доўгага перапынку да вывучэння курганоў вярнуліся ў 90-я гады мінулага стагоддзя. А ў 2007 годзе, напярэдадні 600-годдзя нацыянальнага парка, вучоныя вырашылі наноў абследаваць тутэйшыя мясціны.

— На той час нам была вядома толькі стаянка «Каменюкі-1», гарадзішча жалезнага веку, — распавядае **кіраўнік экспедыцыі, навукова супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Алег ТКАЧОЎ**. — Падчас разведкі даследчыкі адшукалі іншыя археалагічныя помнікі — стаянкі позняга і ранняга мезаліту. Тады ў вучоных узнікла ідэя аб'яднаць іх і стварыць скансэн, інакш кажучы, музей пад адкрытым небам.

На думку археолагаў, пушча выдатна падыходзіць пад такі праект — мясціны тут маляўнічыя, інфраструктура — развітая, наведвальнікаў — шмат. Ажыццявіць амбіцыёзную задуму пачалі сёлета. У найбліжэйшыя тры гады плануюць зрабіць гарадзішча жалезнага веку, жытлы каменнага і бронзавага вякоў, сярэднявечную вёску. Усе аб'екты будуць пабудаваны з улікам тагачасных тэхналогій.

— На пясчаных глебах драўляныя канструкцыі не захаваліся. Аднаўляць помнікі давядзецца па неарганічных рэштках — прыладах працы, кераміцы. Дадаткова далучым вопыт даследчыкаў, якія працавалі на падобных помніках на суседніх тэрыторыях. Карацей, пастараемся паказаць, як паселішчы маглі б выглядаць у старажытнасці, — адзначае Алег Юр'евіч. — Паралельна будзем даследаваць іншыя помнікі. Мяркуем, што да раскопак змогуць далучыцца турысты. У Еўропе археалагічны турызм — абсалютна нармальная практыка.

Па прыклады вядомых і папулярных скансэнаў далёка хадзіць не трэба. Польскі Біскупін — старажытнае гарадзішча лужыцкай культуры — даўно стаў Меккай археалагічнага турызму. Нешта падобнае навукоўцам хацелася б убачыць і на тэрыторыі пушчы. Пакуль яны ўносяць свае прапановы накont бyдучага музея, але апошняе слова застанецца за адміністрацыяй нацыянальнага парка. Дакладна вядома, што першай пад будаўніцтва пойдзе пляцоўка археалагічнага помніка «Каменюкі-1». Таму зараз варта паспець даследаваць яе да канца — інакш хутка гісторыя загіне пад каўшом экскаватара.

**Вопытныя спецыялісты ўжо ведаюць: самыя цікавыя знаходкі «вылазяць» у апошні дзень экспедыцыі. У гэтай справе многае залежыць ад удачы.**

### Кантэкст важнейшы за знаходку

Чым займаліся нашы продкі на гэтым лапіку зямлі?

— Мяркуем, што тут была працоўная пляцоўка, магчыма, па разбіранні і апрацоўцы туш жывёл. Пра гэта нам «распавялі» зламаныя наканечнікі стрэл. У жылым паселішчы мы адкапалі б шмат керамікі, але тут яе няма, — тлумачыць кіраўнік экспедыцыі. — Сярод знаходак у асноўным трапляюцца адходы ад вытворчасці крэмніевай індустрыі — адшчэпы, пласціны. Прылад працы, за выключэннем пары разцоў і скрабка, не знайшлі. Увогуле, у тутэйшых пясчаных глебах нельга разлічваць на багаты «ўлоў». Найбольш багатыя ў гэтым плане — тарфянікавыя паселішчы, дзе можна адшукаць добра захаваныя рэшткі тканіны, вырабы з костак альбо рога.

А жылі людзі непадалёк, на стаянцы «Каменюкі-2». Тут археолагі адкапалі шмат керамікі, чарапкі гаршкоў, а пасля змаглі аднавіць некалькі формаў старажытнага посуду.

Аднак для археолагаў не так важна адкапаць нейкі прадмет, як аднавіць карцінку мінулага — так званы кантэкст.

— Тыповыя ўяўленні пра нашу прафесію зводзяцца да дзвюх рэчаў — адкапаць мамантаў альбо золата, — усміхаецца Алег Юр'евіч. — Археолагі, у адрозненне ад «чорных капальнікаў», не гоняцца за прыгожымі артэфактамі. Для мяне і кавалак керамікі каштоўны, бо, дзякуючы яму, я змагу сабраць агульны пазл: даведаюся, што рабілася на гэтым месцы, чым жылі тутэйшыя пасяленцы.

Даволі часта археалагічныя помнікі разбураюцца пад лесапасадкамі альбо праз дзейнасць «чорных капальнікаў». Гэтай вясной у пушчы рыліся дзікі і выкінулі на паверхню фрагменты керамікі X-XI стагоддзяў. У выніку навукоўцы адкапалі рэдкі археалагічны аб'ект — склеп для захоўвання рэчаў. Праўда, палову тэрыторыі паселішча ўжо засадзілі лесам, і праз пару гадоў там будзе ўжо немагчыма працаваць.

І такіх выпадкаў безліч. Бракуе не мясцін, а спецыялістаў-археолагаў. Прафесія, авеяная рамантыкай, у Беларусі папулярнасцю не карыстаецца. Самі археолагі канстатуюць: у гэтай справе застаюцца толькі людзі, цалкам ёй адданыя.

### Удача таксама патрэбна

— Раскопкі — гэта доўгатэрміновы і ў нечым нават руціны працэс, які складае адну дзясятую частку ўсяго даследавання, — прызнаецца Аляксандра Зуева. — Знойдзеныя матэрыялы трэба памыць, высушыць, рассартаваць, апісаць і зрабіць падрабязную справаздачу. Сістэматызацыяй інфармацыі з адных раскопак можна займацца год ці нават больш.

**Вясной у Пушчы рыліся дзікі і выкінулі на паверхню фрагменты керамікі X-XI стагоддзяў. У выніку навукоўцы адкапалі рэдкі археалагічны аб'ект — склеп для захоўвання рэчаў.**

Вопытныя спецыялісты ўжо ведаюць: самыя цікавыя знаходкі «вылазяць» у апошні дзень экспедыцыі. У гэтай справе многае залежыць ад удачы. Напрыклад, адзін расійскі археолаг дакладна ведаў, на якой пляцоўцы мусіць «хавацца» могільнік жалезнага веку. Каля 15 гадоў вучобы ён прысвяціў раскопкам, але нічога не знайшоў. Пасля выявілася, што ён капаў акурат паміж магіламі — банальна не шанцавала чалавеку. Іншыя шчаслівчыкі могуць закласці шурф на два метры і адразу ж натрапяць на старажытнае пахаванне.

Каго можна сустрэць у экспедыцыі? Вядома, студэнтаў-гісторыкаў, тым больш пасля першага курса навучэнцы гістфака мусяць прайсці абавязковую практыку па археалогіі ці этнаграфіі. Археалагічны антураж — паехаць, пажыць у палатцы, паспяваць песні каля вогнішча і крыху папрацаваць на раскопе — прываблівае не толькі студэнтаў. Многія людзі, не звязаныя з навукай, таксама выбіраюцца ў экспедыцыю хаця б на выхадныя — уражанні таго вартыя.

**Трэцякурснік гістарычнага факультэта БДУ Іван ПРЫСТАЎКА** ездзіць на раскопкі ў якасці валанцёра. Для яго археалогія — справа жыцця і будучая праца.

— Мне цікава даследаваць, як жылі людзі старажытнасці, убачыць мінулае на ўласныя вочы, — распавядае хлопец. — Я пакуль не вызначыўся, кім хачу быць — навукоўцам ці выкладчыкам. Але буду працягваць вывучаць каменны век.

**Першакурсніца гістфака БДУ Дар'я АЛЕКСЯЮК** на раскопкі трапіла ўпершыню, а ўражанняў назбірала на год наперад. У пушчы яна пагладзіла зубра і ўбачыла ваўка. Вельмі хацела адшукаць наканечнік ад стралы, але адкапала гільзу. «Стралялі ў неаліце шмат», — жартуюць калегі. У кожнага з іх «на рахунку» каля тысячы знаходак.

Раскопкі заканчваюцца а другой гадзіне дня, пасля працы студэнты адпачываюць. «Хочацца толькі ў душ і спаць — аднавіць сілы для вечара», — прызнаюцца яны.

— За тры тыдні экспедыцыі студэнты становяцца адной сям'ёй, — адзначае дзяўчына. — Мне напачатку было страшна гатаваць суп на 30 чалавек. А раптам нясмачны атрымаецца? А цяпер гэтыя страхі падаюцца смешнымі.

Галоўны скарб экспедыцыі — новых сяброў і незабыўныя ўражанні — знайшоў для сябе кожны з удзельнікаў раскопак.

### Капаць па сантыметры і менш

На раскопе патрабуюцца акуратнасць і педантычнасць. Выбраную пляцоўку агароджваюць і разбіваюць на квадраты плошчай метр на метр. Нарастанне культурнага слоя ішло паступова, таму капаюць па пластах і квадратах. Археолагі здымаюць мінімальны слой — па сантыметры ці менш. Працуюць шуфлікамі. Пасля пясок і глебу ўважліва прагладаюць, прасейваюць праз сіта. Усё замалёўваецца і фатаграфуецца. З кожнага квадрата знаходкі збіраюцца ў асобны пакунак. У метрычцы пазначаецца назва помніка, год раскопак, раскоп, квадрат, пласт. Здымаюць 10 сантыметраў у кожным квадраце, пасля робяць зачыстку — здымаюць шуфлікам тоненькі пласт зямлі. Дзякуючы няхітрай працэдуры можна ўбачыць усе змяненні ў пласце. Так паступова выбіраюць увесь культурны слой, пасля робяць некалькі праверачных слаёў. Археолагі мусяць цалкам захаваць той ландшафт, на які яны прыходзяць, таму пасля праведзеных прац аднаўляюць насып у першапачатковым выглядзе.



Кожны квадрат вывучаецца па слаях, сантыметр за сантыметрам.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*radziuk@zviazda.by*

**Фота аўтара.**

*Мінск — Камянецкі раён — Мінск.*

З верай у сэрцы

# ЛЕСВІЦА Ў НЕБА

**Пад назвай «Паслухмяныя Богу» праходзіла X Дыяцэзіяльная сустрэча моладзі ў Браславе. Быць на ёй мне давялося ўпершыню. Моладзь з'ехалася ў Санктуарый Маці Божай Валадаркі Азёраў з усёй Віцебскай дыяцэзіі. Я адправілася туды разам з прадстаўнікамі сваёй парафіі з вёскі Параф'янава. Было нас 10 чалавек. У першы дзень, адразу пасля рэгістрацыі, мы вырашылі агледзець маляўнічае наваколле. Убачылі Браслаўскія азёры, злазілі на Замкавую гару. Вядома, сфатаграфаваліся на памяць. Але самае цікавае чакала нас наперадзе.**



На працягу чатырох дзён сустрэчы праходзілі канферэнцыі, дзе ксёндз Аляксей разважаў, як жа быць паслухмянымі Богу. Расказваў цікавыя гісторыі, задаваў нам пытанні. На кожнай Святой Імшы ўсе прысутныя разам слухалі Божае слова, шчырымі малітвамі і спевамі праслаўлялі нябеснага Айца. Падчас катэхэзы мы вучылі хрысціянскія песні, танцы, таксама глядзелі відэаролікі, дзе людзі з розных куткоў свету распавядалі аб тым, як яны павярнуліся да Бога. Нашы аніматары дзялілі нас на невялічкія групы, і мы, пазнаёміўшыся адно з адным, дружна выконвалі творчыя заданні, перадольвалі розныя перашкоды падчас гульняў.

Па вечарах уся моладзь адпачывала пад спевы музычных гуртоў. Я адкрыла для сябе новы хрысціянскі гурт «Рыбы». Спадабаўся творчы запал музыкантаў, духоўная насычанасць іх песень. Таму адразу пасля канцэрта папрасіла заснавальніцу гэтай музычнай суполкі Алену больш падрабязна расказаць мне пра іх.

— Мы праводзім малітвы, адарацыі, служым на рэкалекцыях, сустрэчах моладзі, ездзім з Айцом Аляксандрам па турмах. Чаму «Рыбы»? Гэта на самай справе смешная гісторыя. Наш барабаншчык, калі ствараў сваю групу ў сацыяльнай сетцы, каб мы маглі абменьвацца інфармацыяй, перапісвацца паміж сабой, хацеў назваць яе «Грыбы». Памыліўся адной літарай — і атрымалася «Рыбы». Потым мы знайшлі ў гэтым глыбокі сэнс. Даведаліся, што ёсць шмат хрысціянскага сімвалізму, які датычыцца менавіта рыб.

Галоўную мэту сустрэчы мы выканалі. Моладзь, якая сабралася ў Браславе дзеля таго, каб разам ушанаваць Бога, паразважаць над Божым словам, знайсці адказы на хвалюючыя пытанні, а таксама карысна правесці час, склала адзіную хрысціянскую супольнасць. Кожны з нас узбагаціўся духоўна і, дзякуючы супольнай малітве, умацаваў сваю веру.

**Юлія ЯНУКОВІЧ,**
**выпускніца 11-га класа Параф'янаўскай СШ Докшыцкага раёна.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 08 2015 г.

Друкуецца ў «Маладосці»



**Югася Каляда друкуецца ў «Маладосці» падборкай з пяці(!) аповесцей. Ці знойдзе гераіня «Зайца з гумовым тварам» сяброўку свайго дзяцінства, чытач зможа даведацца, натуральна, толькі на старонках часопіса. А прадстаўлены тут пачатак аповесці дасць магчымасць атрымаць асалоду ад мовы і ходу думкі... Гераіні ці аўтаркі? Югася Каляда любіць ставіць чытача перад невырашальнымі пытаннямі.**

# ЗАЯЦ З ГУМОВЫМ ТВАРАМ

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Наш двор уначы падобны да басейна без вады. Сцены дамоў, паралельна і перпендыкулярна пашнураваныя стыкамі пліт, балконамі, вокнамі, не раўнуючы, кафля. І гулка — добра чуваць, як у калодзежы каналізацыі булькоча адпрацаваная вада.

Я, нібы ў накаўце, ляжала пластом на ложку і ў прагале адчыненых дзвярэй балкона бачыла кавалак перакуленага неба — не спалася.

Нябачны самалёт крэсліў на ім густы адбітак. Людзі спалі ў бетонных скрыначках, адзін пад адным, у пяць слаёў. А я не сплю. Мой энергаблок працуе ў аварыйным рэжыме ў пошуку прычыны паломкі. Накіпелі кантакты, згарэлі дыёды, замкнула і іскрыць? Я перастала прымаць сігналы ад свету, што па той бок ад мяне. Каторую ноч я марна спрабавала вызначыць: ці то мой перадатчык зламаўся, ці то па той бок усё знікла.

Відаць, я на кароткі час заснула, бо перад вачыма паплылі відарысы Сняжынкі, маёй сястры, не бачанай сто гадоў. Яна сядзела на скураным дзедавым крэсле, капрызліва боўтала нагамі і рытмічна адкрывала рот, да якога ўпарта штораз падносіла пюрэ рука кагосьці, зацёртага памяццю.

* * *

Насамрэч яна не была мне сваячкай па крыві. Матчына сястра, цётка Аліса, пабралася шлюбам з дзядзькам Алегам, а той меў дачку, адсуджаную ў першай жонкі. Пра цьмяную перадгісторыю сям'і Перагудаў я дазналася толькі па яе распадзе: дзесяцігадоваму чалавеку ўжо не нахлусіш беспакарана, і мама, уздыхаючы і пазіраючы ўбок, тлумачыла мне, чаму цётка Аліса больш не жадае мець стасункі з уласнай дачкой.

Пякельнае верашчанне таннага будзільніка адгрымела колькі хвілін таму, але я наўмысна ставіла яго наперад, каб набраць паветра перад нырком у ледзяную ваду чарговага дня.

— Ад таго часу мы не бачыліся, — я, заклаўшы рукі за галаву, дзялілася ўспамінамі з Артурчыкам, у якога тады была закахана, — гэта... васямнаццаць гадоў! Думаеш, няшчыра казаць цяпер, што я Сняжынку любіла?.. Заўжды?.. Толькі не згадвала пра яе... А мы прабавілі разам ледзь не ўсё дзяцінства! Якое сямейнае свята ні згадай, з тых, дзе «яўка ўсіх абавязковая», — там Сняжынка; лета, дача — Сняжынка. А прагулкі па парку? А паходы на рэчку?

Я ў спешным парадку вяла маніторынг назапашаных дзіцячых успамінаў; сапраўды, Сняжынка там траплялася, але не з такой частатой і не пад тым наменклатурным нумарам, каб я тут і цяпер, паклаўшы руку на сэрца, запатрабавала ад Сусвету неадменна арганізаваць сустрэчу з сястрой, якая мне і не сястра насамрэч.

У пакой ціха ўвайшоў Фелікс, гаспадар кватэры, і спыніўся насупраць ложка. Артурчык, як зазвычай, зніякавеў пад яго позіркам і знік. Фелікс заўжды глядзеў на мяне з дакорам і нявыказаным пытаннем у вачах, і я пачувалася вінаватай. Вось і цяпер ён спадылба зірнуў на мяне, перавёў позірк на адчынены балкон, выразна ўздыхнуў і пайшоў прэч, празрыста намякаючы мне на патрэбу кіравацца за ім.

Я таксама ўздыхнула, спусціла ногі з ложка, апяклася аб халодную падлогу і намацала пантофлі. Сапраўды, Фелікс скрозь меў рацыю: з адчыненым балконам спаць было даўно холадна і валяцца было ўжо досыць, прыспеў час эвалюцыяніраваць з медузы ў Гома Эрэктуса, ісці збіваць палкай бананы.

Фелікс сядзеў пасярод кухні і чакаў мяне. Без асаблівай, што праўда, радасці адбываліся нашы стасункі: лёс змусіў жыць у адной кватэры, і мы моўчкі неслі гэты... ну, скажам так, крыжык.

— Фелікс, слухай, — я выцягнула з лядоўні бляшанку кансерваў і з задавальненнем убіла ў яе нож, — а калі б ты меў сястру, згубіў яе ў раннім дзяцінстве, а потым прыгадаў, — ты б хацеў яе знайсці?

Мяркуючы па рэакцыі — поўнае маўчанне — майго суседа такія праблемы не хвалявалі.

— Ну добра, тады сфармулюем інакш, — я вываліла печань мінтая на сподачак і прынялася размінаць яе відэльцам. — А калі б цябе раптам знайшла сястра, якую ты не бачыў сто гадоў і з якой вас раз'ядналі ў дзяцінстве? Ты быў бы рады?

Фелікс падышоў да мяне бліжэй, нецярплівы і незадаволены. Я ўявіла, як да нас прыходзяць яго згубленыя ў дзяцінстве сёстры і рассмяялася.

— Ды ты мяне зусім не слухаеш! — я паставіла сподачак з мозгападобнай масай на падлогу. — На, жары, пыса ты прыплюснутая!

Фелікс з пагардай адштурхнуў маю руку і ўзяўся за сняданак, а я падышла да акна і зірнула на тэрмометр. Як хутка прыйшлі халады ў гэтую брыдкую восень. Трэба будзе надзець чорны швэдар пад паліто.

* * *

Раніцы былі б дабрэйшымі, а восень — не такой брыдкай, каб не гэтыя аўтобусныя катаванні «Аэрадром — Навабеліца». Мы з Артурчыкам разам выходзілі з дому, стаялі на прыпынку, удзельнічалі ў штурме аўтобуса і баях за месца, але ў раёне «Лугавой» ён, як зазвычай, знікаў, і мне даводзілася шукаць іншыя сродкі адольваць самоту, калі можна назваць самотнай паездку ў забітым аўтобусе.

Я думала пра Сняжынку: ці рэальна яе знайсці? Ну, знайсці не праблема: Гомель — маленькі горад. І што далей? Што пераменіцца ў жыцці? Яно палепшае? Магічным чынам запоўніцца сэнсам? Вобраз «Магічнае запаўненне жыцця сэнсам» імгненна візуалізаваўся ў выглядзе бутэлькі з-пад піва, пастаўленай у ракавіну пад кран; мела б я псіхіятра, той прыйшоў бы ў экстаз.

Мае думкі, перайшоўшыя з сястры на пустыя бутэлькі, трансфармаваліся ў трагічныя развагі аб марнасці існага. І гэта з раніцы. За акном стракацелі навабеліцкія краявіды, мой прыпынак быў наступны, і варта было ўвайсці ў кантакт з насельніцтвам на тэму «Ці выходзіце?..», але брыдка было варушыцца. Ну добра, я знайду Сняжынку, няхай нават мая любоў не соннае трызненне. І што зменіцца?

«Што-о-о-о?» — дзякуй богу, усе выйшлі, і я за імі. Нічога цудоўнага не чакае нас у жыцці, усё прадказальна, не верыш? — я размаўляла сама з сабой, за адсутнасцю Артурчыка. — Я магу прадказаць сённяшні дзень у дэталях, тыдзень — лёгка! Год — у агульных рысах, і жыццё — хоць цяпер падсумаваць вынікі. Зараз я прыйду на працу, зайду ў кабінет: Светка ўжо сядзіць за сталом у зялёнай кофце, або ў карычневай, або ў зялёнай вадалазцы і чорным пінжаку. Лена сядзіць за кампам з такім суровым выразам твару, нібыта ўсе замінаюць ёй працаваць. Можна будзе зазірнуць у манітор: яна гуляецца ў «Зуму». І тут я пайду да шафы, здыму паліто, скажу «Добрай раніцы!», Ленка хмыкне, не падымаючы вачэй «Н-ну!», а Светка прапішчыць «О-ой, здаро-оў!», а я...»

Не пражыты яшчэ дзень раптам, як з адкрытай дамбы, абрынуўся на мяне мільёнам дакладных падрабязнасцей, і я заплюшчыла вочы ад жаху перад нечаканым прарочым талентам, нават спынілася за два крокі ад дзвярэй канторы, паралізаваная імпульсам не ісці на працу: якой халеры, калі дзень адбыўся? Мая ўнутраная забастоўка доўжылася секунды тры, пакуль яе не перарвала думка-штрэйкбрэхер: «А Артурчык?» — «А-ах, сапраўды, Арту-урчык!» — узгадала я і рушыла ў браму пекла, як быццам з'яву «Артурчык» цяжка было прадказаць з дакладнасцю да слова.

Я штурхнула дзверы ў кабінет, кінуўшы дзеўкам «Добрай раніцы!», і пайшла да шафы.

— Ы-ыгы, — засяроджана працадзіла Ленка; яе хвалявалі лёсы каляровых шарыкаў.

— О-ой, здаро-оў! — прапішчала Светка, і я не паверыла вачам: яна была ў фіялетавым швэдры!

— Ой, Свет, новы купіла? Файна, табе пасуе! — я ўжо была ў стане радавацца новай шмотцы Светкі як падзеі ўласнага жыцця. — А дзе?

«Прудкоўскі, Цэнтральны, ля вакзала. Прудкоўскі, Цэнтральны, ля вакзала. Калі адгадаю, запрашу Артурчыка дадому. Прудкоўскі, Цэнтральны, ля вакзала», — я адправіла ў нябёсы, бадай што, самую палымяную малітву за апошні месяц.

— А кума з Чарнігава прывезла, а ёй малы! — падзялілася радасцю Светка, і мне давялося пераконваць сябе, што малітва мела працяг: «А калі не адгадаю, то Артурчык сам запросіць мяне!»

Я села за стол, выцягнула з шуфляды папку з паперамі, прыгожа расклала іх перад сабой, адкрыла ў кампе базу і ўключыла чайнік, куды з вечара наліла вады. Яшчэ з паўгадзінкі пап'ю каву, апрытомнею, а потым і папрацуем.

Яе імя «Сняжана» ніхто не ўжываў як занадта дарослае для Сняжынкі. Дакладна, я любіла яе, хіба што неўсвядомлена. Маладзейшая за мяне роўна на год, сястрычка была драбнейшая, у бялявых кудзерках, з лялечным роцікам, капрызлівая і дурная. Яна мела толькі тры станы: капрызіла, несла лухту або рабіла глупствы, крыўдавала. Я Сняжынку, як старэйшая малодшую, даглядала, выхоўвала і ахоўвала: ад небяспекі і непрыемнасцей, якія тая таленавіта знаходзіла на роўным месцы. На фотаздымках, дзе мы разам, я абдымаю яе — ці трымаю? — за плечы. Трэба будзе пераглядзець фоткі, чорна-белыя, іх няшмат... А аднаго разу, пакуль я падымалася ў кватэру па мячык і скакалку, Сняжынка паспрачалася з дзяўчынкамі не з нашага двара: бэз — гэта куст ці дрэва? А пасярод двара ў нас буялі бэзавыя зарасці, такія старыя, што галлё было не раўнуючы ствалы. Сняжынка толькі ўбачыла, што я выходжу з пад'езда, як закрычала: «Мая сястра ўсё ведае! Яна зараз скажа!» І я рушыла да іх: няспешна, паказваючы абыякавасць, а насамрэч прыдумляла адказ. «Бэз — гэта дрэвападобны куст», — сказала я такім тонам, нібыта стамілася штодня тлумачыць. А Сняжынка, якую казыталі ўнутраныя чарцяняты, ад чаго яна падскоквала на месцы, падскочыла яшчэ вышэй і паказала дзяўчатам не з нашага двара язык. Адмысловае ўяўленне пра гасціннасць, што тут скажаш.

А што з бэзам? У старым двары я не была сто гадоў. Можа, бэз так разросся, што ўсё сабой запоўніў. Або ён проста здаваўся вялікім; а можа, яго ссеклі. Трэба будзе зазірнуць. А калі я прыйду туды, я стану ля бэзу, ля лаўкі — калі тая жывая — і буду дзяўчынкай не з нашага двара. Лепш не пайду.

**Югася КАЛЯДА**

Камертон настрою

# КУБАК З БУТАНЬЕРКАЙ

## ЭЦЮД ПЕРШЫ

У кожнага з нас ёсць «свае» рэчы. З кожным вашым дотыкам яны пачынаюць дыхаць. Жыць.

І ў мяне таксама ёсць «свае» рэчы. «Ранішнія», «вячэрнія», «летнія», «асеннія»...

Мой ранішні нацюрморт — гэта белы кубачак у ружовыя кветкі перад вачыма.

Штораніцу ў кожнага з нас новы настрой. Ад чаго ён залежыць — невядома. Ад надвор'я, ад сну... Не ведаю. Найчасцей за ўсё мы, толькі прачнуўшыся, наліваем у кубачак гарачае пітво. Мой белы апёкся. Ён дыхае ўсё часцей, часцей... Шэранькі дымок пачынае танцаваць. Фу-уууу... Фу-уууу. Мінулай восенню я чамусьці палюбіла какаву. Цёплую, па-свойму мяккую...

Самае цікавае, што па кубачку можна здагадацца, каму ён належыць. Падказка не толькі памер і малюнак, але і след вуснаў... Пасля дзяўчат застаецца непрыкметная сарамлівая ружовая пляма, пасля жанчын — бардовыя ці колеру морквы ўпэўненыя адбіткі. Кубак — прадмет гасцінны. Ён рады ўсім, хто напоўніць яго цяплом і «растопіць» халодны абадок.

*Пустэча адзіноты яго запаўняе,*
*Квадратная лямпа лашчыць святлом.*
*Кубачак белы ранак чакае,*
*Чакае, хто будзе з ім за сталом.*

***

Кроплі святла, як маленькія феі...
Ужо ноч. Не спіцца...

Задумалася. Ці ёсць у яго характар? Які ён, мой белы кубачак з букетам кветак?.. Ён не хоча злівацца з начным змрокам. І ў цемры слепіць сваёю беласцю. Індывідуаліст ганарлівы.

Чакае невядомую раніцу.



## ЭЦЮД ДРУГІ

Ранішнія праменьчыкі лашчаць акенца. Праз паўпразрыстыя кветкі на цюлі яны прасочваюцца ў кватэру, быццам хочуць з'яднацца з маім сонным сілуэтам. Прыемныя ранішнія імгненні, калі ты з цёплай, патаемнай усмешкай адчуваеш абдымкі перламутравых праменяў.

Белы кубачак з ружовымі кветкамі чакае мяне, чакае маіх абдымкаў. Ранішнія праменьчыкі ўжо аблізнулі яго светлы абадок — яшчэ ўвечары паставіла кубачак насупраць акенца, каб святло пакінула свой след пацалункаў — блік.

Раніцу вырашыла зрабіць мятнай, духмянай, жаўтавата-зялёнай. Кубачак здзіўлены. Ён адвык ад зеленаватага напаўнення. Гэта мой падарунак. Насыпала лісце мяты. Лісточкі выглядаюць, як тэатральныя актрысы, нібы напудраныя, са сціплым водарам парфумы.

Праз акно падзьмуў лёгкі, ледзь адчувальны ветрык — цюль засаромеўся, адышоў убок. Кубачак ажывіўся. Наліла кіпень — ускочылі, быццам непаседы, лісточкі, здаецца, што спрабуюць датыкнуцца да абадка. Непаслухмяны, звілісты дымок павольна падымаецца ў паветры над зялёным цыліндрам. Ад мятнай вадкасці кубачак з ружовымі кветкамі расслабіўся. Млявае, знясіленае лісце ляжыць на дне, аддаўшы свой колер і водар кавалеру з ружовай бутаньеркай...

**Вольга РОПАТ, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

**Фота Сяргея РАСОЛЬКІ.**

Мода аднаго дня

# БУКЕТЫ З ГРЫБОЎ І ЗАСТОЛЬНЫЯ КЛІПЫ

## Аповед пра вясельныя трэнды і стэрэатыпы

**Замужнія дзяўчаты ставяцца да вяселля інакш, чым тыя, хто яшчэ не пабываў па той бок стойкі для роспісу ў ЗАГСе. Не таму, што адразу пасля пячаткі ў пашпарце зразумелі сакральны сэнс шлюбу. Проста пакуль рыхтуешся да ўласнага дня «ікс», міжволі назапашваеш інфармацыю пра вясельныя тэндэнцыі і расцэнкі, якая ўжо не дазваляе ацаніць чужое вяселле адным словам «прыгожа» і робіць цябе экспертам у сферы кветкавых арак і белых сукенак, прынамсі на гэты сезон. Ведаю, бо сама нядаўна выйшла замуж. Што сёння лічыцца модным і колькі грошай патрэбна, каб зрабіць дзень рэгістрацыі новай сям'і «тым самым»? Кошты — сталічныя, парады — суб'ектыўныя.**

### У КОЖНАГА СВАЯ АТМАСФЕРА

Каб быць у трэндзе, прыдумайце свайму вяселлю тэму. Аб'яднаць усе дэталі — ад запрашальнікаў да кветак у букеце нявесты — можа колер (сёлета дызайнеры рэкамендуюць спыніцца на аліўкавым, рамантычным, лавандавым ці вінным) або пэўны стыль (класічны, рамантычны, праванс, вінтаж). Найбольшай папулярнасцю ў рэдактараў модных вясельных часопісаў карыстаецца боха — напрамак, які спалучае багемнасць і свабодны стыль хіпі.



**Не заходзьце ў брэндавыя разрэкламаваныя салоны. Нават з думкай «я проста памераю». Як спяваў гурт «Няпара»: «Плачь и смотри со стороны...» Там дорага не толькі звонку.**

Выбар месца, дзе ўсё будзе адбывацца, звычайна дыктуе бюджэт. Банкет у сталоўцы абыдзецца ў 300-450 тысяч на чалавека, у кавярні ці рэстаране — ад 550 тысяч да 1,3 мільёна рублёў за кожнага госця. Хочаце адзначыць свята ў катэджы на прыродзе (апошнім часам модна палюбіла менавіта гэты варыянт)? Накіньце да кошту кавярні яшчэ тысячу долараў. Не забывайцеся, што залу яшчэ трэба ўпрыгожыць. І калі ў рэстаранах можна абысціся мінімальнымі выдаткамі (часам дастаткова толькі паставіць кветкі на стол маладых), то на аздабленне сярэднестатыстычнай сталоўкі давядзецца раскашэліцца. За тое, каб надаць сталам і крэслам святочны выгляд, з вас возьмуць 150 долараў. Хочаце кампазіцыі з жывых кветак — даплаціце яшчэ за раслінасць. Знаёмая дызайнер расказвала, што вельмі часта, каб сэканоміць, арандуюць ледзь не самую танную сталовую і спадзяюцца, што афарміцель зробіць з гэтага памяшкання «цукерку». У прынцыпе, гэта магчыма, але за «рэканструкцыю» дызайнеры выставяць такі кошт, што было б прасцей зняць добрую кавярню ці сціплы рэстаран.

Распісвацца ў ЗАГСе — мінулае стагоддзе. Пары ўсё часцей ладзяць выязныя рэгістрацыі. У парках, рэстаранах, на прысядзібным участку. Вельмі зручна, прыгожа, але, зразумела, не бясплатна. Адна толькі арка (галоўны атрыбут) з жывымі кветкамі каштуе ад 200 да 400 долараў. Сэканоміць можна, калі замовіць не жывую, упрыгожаную штучнымі ружамі ці тканінай.

Шукаць дызайнераў, замаўляць запрашальныя карткі, «гугліць» варыянты афармлення і пры гэтым не выпадаць з жыцця на пару тыдняў — вельмі складана. Вядома, ад чагосьці можна адмовіцца, падключыць да арганізацыі бацькоў. Ёсць і апантаныя нявесты (я была з іх ліку), якія любяць усё трымаць пад кантролем і самі каардынуюць працэс. Калі ж сітуацыя і фінансы дазваляюць, лягчэй запрасіць вясельнага распарадчыка. За 500-700 долараў ён возьме арганізацыйныя пытанні на сябе. Вам застанецца толькі роля пераборлівага інвестара: будзеце выказваць пажаданні, крывіць нос і ўзгадняць праекты.

### ЗБОРЫ НЯВЕСТЫ — ГЭТА НЯПРОСТА...

Галоўная інтрыга любога вяселля — сукенка нявесты. Што з фасонаў — «русалка», А-сілуэт, прамы ці грэчаскі пакрой — найбольш модна, сказаць складана. Таму пры выбары сукенкі лепш карыстацца ўласным густам і пачуццём меры. І ўлічваць асаблівасці сваёй фігуры. Напрыклад, строй з адразным верхам (адзін з трэндаў гэтага сезона) падыдзе толькі стройным дзяўчатам. Кошты на вясельныя сукенкі самыя розныя. У сярэднестатыстычным не вельмі раскручаным салоне купіць белы строй можна за 300-500 долараў. Калі да вас гэтую сукенку ўжо прымерала не адна нявеста, то арандаваць яе можна за суму, удвая меншую.

Парада тым, хто абмежаваны ў фінансах і шукае варыянт «прыгожа і бюджэтна»: не заходзьце ў брэндавыя разрэкламаваныя салоны. Нават з думкай «я проста памераю». Як спяваў гурт «Няпара»: «Плачь и смотри со стороны...» Там дорага не толькі звонку. Я на сайце аднаго з такіх буцікоў нагледзела сабе сукенку мары, не менш. Пасля выхадных, праведзеных на рынку ў пошуках прыстойнага строю, усё ж такі вырашыла зазірнуць у той салон. На маё шчасце, ідэальную сукенку ўжо прадалі. Але я ўсё роўна вырашыла пацікавіцца коштамі. Сукенка на пракат — 700 долараў, купіць — больш за тысячу. «Дзякуй, мы падумаем». А што яшчэ заставалася адказаць?

Абутак у вясельных салонах я набываць не раіла б. Па-першае, дорага. Прыгожыя светлыя туфлі ці басаножкі можна купіць і ў звычайнай краме. Па-другое, навошта вам пара белых галошаў, аблепленых кветкамі і стразамі (а большасць мадэляў, пазначаных як вясельныя, так і выглядаюць), якія вы больш ніколі не абуеце?

Наступны пункт — макіяж і прычоска. Можаце зрабіць гэта самі? Цудоўна. Не? Рыхтуйце 80-120 долараў. Меркаванні ўсіх вясельных крытыкаў сыходзяцца на тым, што нявеста павінна выглядаць свежай і максімальна натуральнай. Залітыя лакам завіткі і двухпавярховыя начосы пакіньце для конкурсаў цырульніцкага майстэрства. Ідэальны варыянт — распушчаныя ці сабраныя ў простую прычоску валасы з эфектам неахайнасці.

І, вядома, букет. Найбольшай павагай у модніц карыстаюцца піёны. Папулярныя таксама піёнападобныя ружы, анемоны, гартэнзія. Зноў успамінаем пра тэму вяселля і эфект неахайнасці. Замовіць модны букет у фларыста — 100-150 долараў. Аматарам экзотыкі і эпатажу варта звярнуць увагу на сукуленты (родзічы кактусаў, растуць на падаконніку ў кожнай другой сям'і) і... дрэўныя грыбы.

**Не забыцца пра жаніха**

**Падазраю, што ў большасці выпадкаў усё адбываецца, як і ў нашай пары. Касцюм (класічны чорны ці сіні варыянт заўсёды ў модзе) жаніх набыў з другога паходу ў краму (у першы раз проста грошай з сабой не было, хаця кошты на касцюмы беларускай вытворчасці дэмакратычныя — ад 1,5 да 3 мільёнаў рублёў), туфлі купіў у тым жа гандлёвым цэнтры ў аддзеле насупраць. Усё, гатовы.**

### СВЯТЛО, КАМЕРА, МАТОР!

Якое ж вяселле без фатографа? Яго паслугі абыдуцца ў сярэднім 500 долараў. Ёсць і бюджэтны варыянт: запрасіць таго ж фатографа не на ўвесь дзень, а толькі на чатыры гадзіны. Шпацыр і рэгістрацыю здымуць за 300 долараў. Наш вясельны фатограф прызналася, што сёлета многія выбіраюць менавіта апошні варыянт.

**Вельмі часта, каб сэканоміць, арандуюць ледзь не самую танную сталовую і спадзяюцца, што афарміцель зробіць з гэтага памяшкання «цукерку». Але за «рэканструкцыю» дызайнеры выставяць такі кошт, што было б прасцей зняць добрую кавярню ці сціплы рэстаран.**

Хочаце, каб у архіве засталося вясельнае відэа? Забудзьцеся пра апаратараў, якія дакументуюць дзень з самай раніцы і да апошняга госця. Чатырохгадзінны рэпартаж пра тое, як усё было, здолее паглядзець, бадай, толькі ваша бабуля. Цяпер замаўляюць кароткія кліпы, зманціраваныя па некалькі хвілін (па насычанасці і эмацыйнасці гэтыя ролікі куды мацнейшыя за вясельную дакументалістыку). Цана пытання — 600-800 долараў.

Прадастаўляць гасцей за банкетным сталом самім сабе не камільфо. Таму патрэбны вядучы. Можна яшчэ запрасіць кавер-бэнд, пясочнага мастака, фаер-шоу... За кожны пункт — плюс 500 долараў да агульных расходаў.

...Ідэальнае вяселле, як і шчасце, за грошы не купіш. Таму не трэба траціць апошняе і набіраць крэдыты. Смела адмаўляйцеся ад любога з пералічаных вышэй пунктаў — гэта ваш дзень, не здымкі для моднага часопіса і не шоу-праграма для родзічаў і сяброў (хаця і пра іх не трэба забывацца). Галоўнае, каб самой пары гэты дзень запомніўся...

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Умець... здзіўляцца

# КАЛІ СЫХОДЗІЦЬ ЮНАЦТВА?

**Калі мы перастаём быць юнымі? Калі шпалеры ў пакоі ўжо не размаляваны і ты больш не правяраеш аўтобусны білет на прадмет яго «шчаслівасці»? Можа, гэта здараецца, калі атрымліваем свае першыя грошы? Ці калі адводзім дзіця ў садок? Ці нават ужо заўтра? Але ж хіба для нас з табой існуе заўтра?**



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

У заплечніках зубная шчотка і адзенне пацяплей, у кішэнях нейкая дробязь, якой наўрад ці хопіць на праезд у аўтобусе, а замест думак — парывы ветру, якія рассейваюць парасткі нашых мар па ўсім свеце. На мінулым тыдні мы дзяліліся вершамі на паэтычным вечары і спявалі песні пад гітару, учора мы змагаліся за правы жывёл, сёння — арганізоўваем акцыю па ўборцы смецця. Мы ведаем усе веласіпедныя маршруты, нашы кеды знасіліся да дзірак, а валасы пахнуць вогнішчамі, разведзенымі на беразе ракі халаднаватымі жнівеньскімі вечарамі. У нашых галовах змяшчаюцца цытаты з любімых кніг і вершаў, мы памятаем дні нараджэння ўсіх родных і сяброў, мы пасылаем паштоўкі ў іншыя краіны і вучым маленькіх дзяцей рабіць жураўлікаў з паперы. Мы хочам ведаць столькі, колькі, здавалася б, не можа змясціцца нават у Александрыйскую бібліятэку! Але калі ж тады сыходзіць юнацтва?..

Нядаўна я спыталася ў свайго бацькі, калі мы абмяркоўвалі праблемы моладзі, як мы можам глядзець на адны і тыя ж рэчы аднолькава — у нас жа такая вялікая розніца ва ўзросце? Тата мне адказаў, што ён такі ж, як і я, пакуль здольны вучыцца ў жыцця чамусьці новаму. Я доўга думала над гэтымі словамі і толькі зусім нядаўна зразумела, што юнацтва не чакае нейкага адмысловага моманту, каб сысці ад нас. Калі мы пачынаем думаць, што ведаем пра жыццё ўсё, мы праганяем яго самі. Чалавек павінен здзіўляцца гэтаму свету і пастаянна бачыць у ім толькі прыгожае.

Мінулым летам я са сваёй сяброўкай прагульвалася па беразе ракі. Мы былі так захоплены размовай, што не заўважылі, як сонца пачало садзіцца. Нас ахапіла паніка. Да моста — некалькі гадзін хадзьбы, а другой магчымасці трапіць на другі бераг не было. Мы ўжо амаль змірыліся са сваім познім вяртаннем, як Саша, мая сяброўка, убачыла край лодкі, які выглядваў з-за куста, і пачула залівны дзіцячы смех. Прайшлі крыху наперад, і перад нашымі вачыма прадстаў дзіўна-цёплы малюнак, які прымусіў нас усміхнуцца. Дзядуля вучыў сваю маленькую ўнучку плаваць, паказваў ёй, як трэба трымаць ручкі і правільна дыхаць, а малая залівалася вясёлым смехам і боўталася ў вадзе. Мы падышлі да дзядулі і спыталі, якім спосабам можна было б хутчэй перабрацца на другі бераг ракі. Стары нас не абнадзеіў — адзіным выхадам было вярнуцца назад. Пасля гэтага ён зірнуў на сваю ўнучку, якая гучна хіхікала, потым паглядзеў на нас сваімі добрымі нябесна-блакітнымі вачыма і прапанаваў: «Мы хутка дадому збіраемся. Можам і вас падвезці». Праз некалькі хвілін мы ціха плылі па рацэ. Спакой вады парушалі толькі вёслы, з якімі ўмела спраўляўся дзядуля.

**Юнацтва не чакае нейкага адмысловага моманту, каб сысці ад нас. Калі мы пачынаем думаць, што ведаем пра жыццё ўсё, мы праганяем яго самі.**

Ён расказваў нам цікавыя гісторыі, дзяліўся забаўнымі выпадкамі з жыцця. Мне здавалася, што гэта была размова са старым добрым сябрам, з якім мы не бачыліся шмат гадоў і праз многае прайшлі разам. А ён усё распавядаў аб сваім цяперашнім жыцці, дзяліўся прыемнымі клопатамі. А я, як зачараваная, глядзела на яго і думала аб тым, што гэты чалавек ні на секунду не старэйшы за мяне. Ведаеце чаму? Ды таму, што ён да гэтай пары здзіўляецца акаляючаму свету і бачыць у ім толькі прыгожае. А гэта значыць, што мы — юныя, пакуль нам не ўсё роўна.

**Аліна КАШЭВІЧ, выпускніца 11-га класа гімназіі імя Я. Купалы г. Мазыра.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ПАНТАЛОНЫ КАРАЛЕВЫ

**«Прыгажосць — страшная сіла». «Прыгажосць выратуе свет». Усе мы ледзьве не з маленства ведаем гэтыя выслоўі і ўжываем, ужо нават асабліва не задумваючыся над сэнсам, закладзеным у іх. А ён цяпер можа быць зу-у-сім іншым... Як там у анекдоце? «За апошнія 25 гадоў у фразе «Хлопчык у клубе склеіў мадэль» змяніліся значэнні ўсіх слоў». Вось вам прыклады. Колішняя 46-гадовая мадэль з Канады прамяняла камфортнае свецкае жыццё на ўдзел у... баях на Блізкім Усходзе. Не маючы ніякай ваеннай падрыхтоўкі, яна таймымі сцежкамі кантрабандыстаў з Ірака перабралася ў Сірыю і далучылася да курдскай баявой групоўкі. І чатыры месяцы ваявала з ісламістамі, пакуль ногі не пачалі падкошвацца ад стомы і недаядання. Ёй пашчасціла, што дадому здолела вярнуцца жывой. Вось вам і прыгажосць, якая «ратуе свет» з аўтаматам у руках у прамым сэнсе слоў. Але тут хаця б нейкія перакананні прысутнічаюць.**

А вось колішняя 29-гадовая «Міс Боснія» і зорка «Плэйбоя» падазраецца ва ўдзеле ў бандзе, якая скрала з банкаў сем мільёнаў долараў. Прыгажуню абвінавацілі ў забойстве пяці чалавек і замаху на забойства яшчэ аднаго — свайго колішняга палюбоўніка. («Ён перастаў абдымаць мяне ў сне». — «Але вы нанеслі пацярпеламу дзевяць нажавых раненняў». — «ЁН. ПЕРАСТАЎ. АБДЫМАЦЬ. МЯНЕ. У СНЕ».) Бландзінцы адной толькі кароны каралевы аказалася недастаткова. Захацелася яшчэ больш грошай і вострых адчуванняў. На жаль, так бывае дастаткова часта, калі тая ці іншая асоба, атрымаўшы карону пераможцы на конкурсе прыгажосці (хаця за гэтае дасягненне ў большай ступені трэба дзякаваць бацькам), лічыць, што разам з гэтым сімвалам ёй выдадзены яшчэ і нейкі адмысловы німб, што дазваляе ставіцца з пагардай да навакольных. Сапраўды, а хто яны такія ў параўнанні з каралевай?! Нікчэмныя людзі, няўдачнікі! А мне дазволена ўсё! Глядзіце і слухайце!

**«Трэба заўжды быць ветлівымі з людзьмі, калі падымаешся ўверх. Бо з імі можна сустрэцца, спускаючыся ўніз».**

Так, актрыса Эмілія Кларк — выканаўца ролі ў папулярным серыяле «Гульні прастолаў» — апублікавала ў Instagram фатаграфію, якая выклікала бурную рэакцыю ў сеціве. На гэтым здымку «каралева» сядзіць на ўнітазе, дэманструючы, з якімі складанасцямі часам даводзіцца сутыкацца «зоркам» кіно, якія апранаюць для дэфіле па чырвонай дарожцы занадта доўгія і адмыслова скроеныя сукенкі. У вас яшчэ па шчацэ не пабегла скупая мужчынская сляза? Мне ж хочацца з гэтай нагоды прыгадаць чарговы анекдот. «Яна любіла Н'ю-Ёрк, ментолавыя цыгарэты і ванільную каву, але швейны тэхнікум выбіў з яе гэтую дурноту». Актрыса суправадзіла здымак словамі: «Вялікая сукенка — вялікія праблемы! А вы мне не дапаможаце? Такая яна, рэальнасць, гэтага вам не ўбачыць на чырвонай дарожцы! Дзякуй за вялікія ўнітазы!» Што на гэта скажаш? У інтэрнэце нехак бачыў фотаздымак нейкай сапраўднай манаршай сям'і, а пад ім подпіс: «Дарагія дзяўчаты, тут адлюстравана каралеўская сям'я. Калі вас няма на гэтым фота — супакойцеся: вы не каралевы і не прынцэсы. Будзьце працейшымі...» Слушная парада, праўда?

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



Нехак шмат гадоў таму давялося браць інтэрв'ю ў салісткі вельмі папулярнага на той час у краіне і за яе межамі музычнага гурта, чые песні гучалі тады, як кажуць, ледзьве не з кожнага праса. Дык вось, мы з гэтай дзяўчынай былі родам з аднаго пасёлка, вучыліся ў адной школе, хаця і ў розныя часы, а яе бацькі выкладалі ў нас некалькі прадметаў. Нягледзячы на гэта, падчас размовы юная асоба спрабавала «ўключыць зорку». Чаму спрабавала? У сілу яе ўзросту патугі быць «каралевай становішча» выглядалі недарэчна і нават вульгарна, а з вуснаў «банцікам» у адказ нават на самыя простыя пытанні чулася толькі нейкае незразумелае мармытанне...

Гэта я да чаго? «Зорка» неўзабаве страціла колішнюю папулярнасць, пераехала ў іншую краіну, у яе жыцці быў шэраг скандалаў, а калі выпадкова ўбачыў яе па тэлевізары праз нейкі час, дык не адразу пазнаў — так яе «разнесла»... Галоўная гераіня фільма «Феламена» — сталая жанчына, якая ўсё жыццё марна шукае свайго сына, мудра сказала: «Трэба заўжды быць ветлівымі з людзьмі, калі падымаешся ўверх. Бо з імі можна сустрэцца, спускаючыся ўніз».

«А пры чым тут панталоны?» — скажа чытач, прыгадаўшы загаловак. Справа ў тым, што нядаўна на аўкцыёне ў Вялікабрытаніі гэты прадмет жаночага гардэроба, які ў свой час належаў каралеве Вікторыі і датуецца канцом 1890-х гадоў, быў прададзены за больш чым 12 тысяч фунтаў. Ніжняя бялізна пайшла з малатка разам з начной кашуляй, панчохамі і шляпамі, якія насілі Яе Высокасць і прынцэса Аліса. Паведамляецца, што гэта ўжо трэці прадмет са сподняга каралевы, які набываюць за рэкордную цану. Купіў, у тым ліку і панталоны, нейкі прыватны калекцыянер. Што тычыцца яго, дык, як на мой погляд, гэты дзіўны крок можна патлумачыць, мабыць, нейкім адмысловым (калі не сказаць хваравітым) жаданнем хоць бы неяк наблізіцца да асоб «блакітнай крыві». Але я хачу сказаць пра іншае. Пра каралеву. Гэты прадмет гардэроба сведчыць пра тое, што Яе Вялікасць, нягледзячы на высокае званне, была найперш звычайным чалавекам. А ўжо потым — усё астатняе. І гэта, як мне падаецца, павінна быць галоўным правілам у жыцці.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Пра сябе трэба нагадваць...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Удзел у шоу «Адзін у адзін» прынёс вам перамогу. Чаго каштавала такое дасягненне?***

— Усе вобразы былі складанымі, бо такой творчасцю я не займаюся кожны дзень, у адрозненне ад заняткаў па вакале, дыхальнай гімнастыкай і гэтак далей. Таму, безумоўна, было складана не толькі тэхнічна, але і псіхалагічна. А калі трапляўся жаночы вобраз, то і ўдвая цяжэй. Як яго распрацоўваць? Аднаго грыму недастаткова, бо патрэбна яшчэ памяняць тэмбр голасу (можна і мужчынскім спяваць, але атрымаецца дысананс). І тады шукаеш тую мяжу, дзе будуць арганічна спалучацца знешнасць, голас і манера паводзін арыгінала. У мяне была цэлая галерэя вобразаў: ад Фарэла Уільямса да Яўгена Мартынава. І чым я ганаруся, дык гэта тым, што ўсе яны былі рознымі. Я не паўтараўся.

***— Пасля шоу вы неаднаразова казалі, што набылі вопыт...***

— Праект стаў для мяне добрай школай, бо з'явілася магчымасць паглядзець на сябе збоку: як я магу выконваць тую ці іншую песню, знаходзячыся ў розных вобразах? Магчыма, аднойчы я запішу кампазіцыю, не ўласцівую мне, і такі вопыт спатрэбіцца. Важнай была таксама праца ў камандзе, бо калі чалавек робіць усё сам, то гэта нагадвае самадзейнасць. А я прыхільнік таго, каб кожны займаўся сваёй справай і, наогул, каб ва ўсіх у нас былі памочнікі, якія дапамагалі б звярнуць увагу на памылкі. Калі такія людзі ёсць, то можна працаваць спакойна.

**«З'язджаць у нікуды — адна гісторыя. А калі разумееш, што цябе чакае ў іншай краіне, тады зусім іншы расклад. Я ехаў падпісваць кантракт, зарабляць».**

***— Праект «Адзін у адзін» азмрочыла навіна пра смерць аднаго з удзельнікаў — Батырхана Шукенава. Ці не задумваецеся вы ў такія моманты пра тое, што можаце не паспець нечага ў жыцці?***

— Я рэальна гляджу на рэчы і прымаю любую сітуацыю такой, якая яна ёсць. Калі б я ведаў, што мяне чакае ў найбліжэйшай будучыні, тады я хваляваўся б пра тое, як паспець зрабіць усё задуманае. А так у мяне ёсць мэты, я іду да іх, ведаючы, як дасягнуць іх у найбліжэйшы час. Не варта хвалявацца з прычыны таго, што чакае вас за паваротам. Трэба клапаціцца пра сваё здароўе і аберагаць сваіх блізкіх і дарагіх людзей. Кожнаму я жадаю найперш за ўсё думаць пра гэта. Своечасова!

***— Вернемся да пачатку кар'еры. Пасля перамогі на праекце «Народны артыст-2» у вашай творчасці быў даволі спакойны перыяд...***

— Паняцце «зацішша», калі мы гаворым пра артыста, вельмі адноснае. Безумоўна, на «Народным артысце» ў мяне паўгода былі эфіры на тэлебачанні, а потым — толькі ўдзел у асобных канцэртах. Але творчае жыццё працягвалася: былі гастролі, пісаліся песні. Разумееце, публіцы трэба пра сябе перыядычна нагадваць. Аднак рабіць гэта так, каб і ты, і твае песні не надакучылі. Інакш будзе такі ж эфект, як ад любімай стравы, якую ясі штодня. З жыццёвага: я люблю торт «Напалеон», які пячэ мая маці. І яна гатуе яго кожны раз да майго прыезду. Дома я бываю раз у тры месяцы, таму і смак застаецца, і эмоцыі. Тое ж і з артыстамі. Сэнс у тым, каб выканаўцу хацелі бачыць, чуць, чакалі яго прыезду. І зноў, вяртаючыся да праекта «Адзін у адзін»,



я разумею, што дзесяць гадоў таму перамога на «Народным артысце» была невыпадковай, бо пераможцу выбіралі тэлегледачы. Таму важна нагадваць пра сваё існаванне ўдзелам у такіх праектах і трымаць сваіх прыхільнікаў у курсе знакавых падзей.

***— Вы родам з Бабруйска. Калі бываеце там, ці адчуваеце змены, што адбываюцца ў горадзе?***

— Бываю там нячаста, паколькі ёсць праца і трэба займацца справамі... Аднак, наведваючыся ў Бабруйск, я заўважыў, што чым больш дарослым станаўлюся, тым меншымі мне падаюцца будынкі роднага горада. Прысутнічае пачуццё настальгіі. Прыязджаючы ў Беларусь, я стараюся наведацца ў госці не толькі да бацькоў, але і ў тыя месцы, дзе вучыўся і працаваў па першым часе. З імі звязаны важныя этапы ў маім жыцці. І прыемна разумець, што я магу вярнуцца сюды і адчуць: я на радзіме. Не проста ў краіне, у якой нарадзіўся, а на зямлі, якую люблю, на якой рос і атрымаў адукацыю, дзе жывуць мае маці і бацька. Таму, безумоўна, кожны раз еду ў Беларусь з лёгкім пачуццём хвалявання.



***— Пераезд у Маскву падзяліў жыццё на перыяды «да» і «пасля»?***

— Там я жыву ўжо 11 гадоў і, параўноўваючы гэтыя перыяд з жыццём у Беларусі, разумею розніцу. Але складаней адаптацыі, пра якую так часта можна пачуць, у мяне не было. Я здымаў кватэру, меў працу. У чалавека заўсёды ёсць мэта, калі ён адважваецца на такі крок. Безумоўна, з'язджаць у нікуды — адна гісторыя. А калі разумееш, што цябе чакае ў іншай краіне, тады зусім іншы расклад. Я ехаў падпісваць кантракт, зарабляць. Складанасці былі і ёсць, але яны неістотныя. І зноў жа важна разумець, што нічога не даецца нам у жыцці проста так. Я стараюся прымаць з годнасцю і добрыя, і дрэнныя сітуацыі, якія здараюцца са мной, і абавязкова раблю высновы.

**«У мяне была цэлая галерэя вобразаў ад Фарэла Уільямса да Яўгена Мартынава. І чым я ганаруся, дык гэта тым, што ўсе яны былі рознымі. Я не паўтараўся».**

***— У вас няма страху страціць тое, што маеце як артыст?***

— Такі страх у мяне, дзякаваць Богу, з'явіўся даўно. Я разумею, што зараз спяваю, а заўтра такога жадання ці магчымасці можа не быць. І я загадзя рыхтаваўся да таго, каб сёння ў мяне быў стабільны прыбытак, жыццё ў дастатку. Бо не малюю сабе радасную перспектыву, быццам буду на сцэне заўсёды.

***— Шоу-бізнес лічыцца асяродкам, дзе ёсць і сябры, і ворагі. Якія людзі ў вашым атачэнні?***

— Гэта мае калегі. Перайсці нейкую мяжу паміж працай і сяброўствам не атрымліваецца: спецыяльна з кімсьці сябраваць я не хачу (а такое ў нашым асяродку бывае). Я адкрыты з тымі людзьмі, хто мяне добра ведае. А наогул, не кожнага пускаю ў сваё жыццё.

***— Улічваючы вашу закрытасць, ці не з'яўляецца для вас публічнасць цяжарам?***

— Я выконваю песні, удзельнічаю ў розных праектах. Нешта могуць напісаць пра маё асабістае жыццё... Але гэтыя людзі не вячэраюць у маёй кампаніі, не ходзяць са мной на дні нараджэння і не бываюць гасцямі ў маім доме. Я не буду марнаваць час на тое, каб высвятляць з кімсьці адносіны, перажываць, даказваць уласную правату...

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.022.
Нумар падпісаны ў 19.30 12.08.2015 г.

■ Таямніцы Зямлі

# ЛЕГЕНДЫ ЗАГАДКАВЫХ ПАРТУГАЛЬСКІХ МЕГАЛІТАЎ

**Старажытныя еўрапейцы распавядалі легенды пра неверагодна моцных загадкавых жанчын, якія збудавалі першыя каменныя грабніцы.**

З аднаго боку, казалі, што яны даравалі людзям багацце і ўрадлівасць, карысныя навыкі фермерства і піваварства і не прасілі ўзамен нічога, акрамя малака. З другога боку, іх таксама апісвалі як змей з быкамі-захавальнікамі: яны праклінялі людзей і паглыналі энергію сонца. Часам іх малявалі прыгожымі паўжанчынамі-паўбыкамі, якія ахоўваюць дальмены і могуць гаварыць з мёртвымі, прасці сонечныя прамяні і нават ствараць свет.



Каза дэ Моўра (дом Моўры), дальмен у Партугаліі.

Археолаг Хена Ліндстрэм у сваёй магістарскай дысертацыі 2014 года апісала казкі і легенды, якімі абраслі магчымыя стваральнікі дальменаў. У яе займальнай працы ёсць гісторыі з розных частак Еўропы пра зачараваных моўр, як называюць гэтых загадкавых жанчын.

Радыевугляродны аналіз паказаў, што будаўніцтва мегалітных магільняў адбывалася паміж 4800 і 3800 гадамі да н. э., гэта значыць, у часы пачатку новага каменнага веку (неаліту). Спачатку былі ўзведзены менгіры (асобна стаячыя камяні), аднак потым людзі пачалі рабіць кругавыя каменныя кампазіцыі з вялікай колькасці груд. У адной толькі Іберыі вядомы тысячы мегалітаў. Лічыцца, што партугальцы былі аднымі з першых, хто заняўся іх узвядзеннем. «Моўры былі ўсемагутнымі і бессмяротнымі, валодалі вечнай маладосцю і прыгажосцю, багаццем і мудрасцю і навыкамі, якім яны навучалі людзей. Па легендах, рэвалюцыя неаліту звязана з моўрамі, менавіта дзякуючы ім людзі навучыліся варыць сыр і пяць, араць зямлю. Моўры падарылі людзям авечак, свіней і



Выразаныя ў камені магільнікі ў Форнас дэ Альгадрэс (Партугалія), у якіх, па легендах, моўры замешвалі хлеб.

кароў», — напісала Ліндстрэм.

Лінгвістычна моўр звязваюць з іншымі еўрапейскімі багінямі, такімі, як, напрыклад, мойры, якія захоўвалі лёсы ўсіх людзей і якіх баяўся сам Зеўс. Кажуць, што моўры існавалі задоўга да стварэння чалавека. Калі ж з'явіліся людзі, моўры сталі культурнымі героямі: яны навучылі людзей фермерству і жывёлагадоўлі, навігацыі і апрацоўцы металаў.

«Моўры прыйшлі на Зямлю ў пачатку часоў, яны ж яе і сфармавалі. Горы і раўніны, рэкі, дальмены і менгіры, чырвоныя малюнкі на скалах — па легендах, гэта ўсё з'явілася менавіта дзякуючы моўрам. Яны ж далі нараджэнне дзецям, продкам абшчыны, якая і распавядае гэтую легенду», — лічыць Ліндстрэм.

Ліндстрэм апісала і самі дальмены: «Сімвалы на партугальскіх дальменах, іх сувязь з узыходзячым сонцам і раўнадзенства поўнага месяца могуць многае нам расказаць пра іх лёс у перараджэнні. Мастацтва само па сабе можа служыць даведнікам для ўсіх людзей, жывых, мёртвых, ненароджаных, паміж светамі мёртвых і жывых. Дальмены, несумненна, служылі месцам пахавання і рытуальных пахаванняў, аднак цалкам верагодна, што гэта была не адзіная іх функцыя і, магчыма, нават не галоўная. Найхутчэй за ўсё, яны адыгрывалі тую ж ролю, што і цэрквы ў эпоху хрысціянства: былі духоўнымі цэнтрамі, вакол якіх магла сабрацца абшчына і абмеркаваць справы надзённыя або адсвяткаваць нейкія важныя падзеі».

Пазней хрысціянскія біскупы забаранілі штогадовыя святкаванні вакол дальменаў. Больш за тое, царква разбурыла многія з іх, абвясціўшы святынямі іншыя месцы. І ўсё ж легенда пра моўр дайшла да нашых дзён.

■ Сёння на заўтра

# АГАРОД НА АКНЕ



## Хатнія фермы выратуюць чалавецтва ад харчовага крызісу?

**Насельніцтва Зямлі імкліва расце з кожным годам. Актыўна развіваецца сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць, таму што трэба ўсё больш ежы, каб пракарміць чалавецтва. Але зразумела, што рана ці позна наступіць момант, калі ежы на ўсіх папросту не хопіць. І гаворка ідзе не толькі пра народы бедных краін, якім і так жывецца несалодка, але і пра развітыя дзяржавы.**

Харчовы крызіс — гэта толькі пытанне часу. І лепш ужо цяпер пачынаць шукаць альтэрнатыўныя спосабы вырошчвання ежы. Кампанія Philips добра знаёма спажыўцу дзякуючы сваёй бытавой тэхніцы. Менавіта інжынеры гэтай нідэрландскай кампаніі прапанавалі свой варыянт вырашэння праблемы недахопу харчавання: вы можаце вырошчваць ежу ў сябе дома пры дапамозе асаблівай LED-падсветкі, якая замяняе раслінам сонечнае святло.

Philips ужо пабудавала і запусціла невялікую ферму GrowWise City ў Нідэрландах, дзе на плошчы каля 230 квадратных метраў спецыялісты кампаніі распрацоўваюць схемы росту сельскагаспадарчых культур пад святлом LED-лямпаў. Патэнцыйна гэтая распрацоўка дазволіць фермерам будучыні вырошчваць ежу круглы год, нягледзячы на ўмовы надвор'я і іншыя знешнія фактары, якія часам прыводзяць да страты ўраджаю. Кожная расліна патрабуе індывідуальнай наладкі сістэмы асвятлення. Менавіта на рашэнне гэтага пытання ў супрацоўнікаў фермы ідзе асноўная частка працоўнага часу. Гародніна на ферме расце без выкарыстання якіх-небудзь пестыцыдаў, што, зразумела, парадуе аматараў арганічнай ежы.

У памяшканні фермы восем пакояў. Кожны з іх — з розным кліматам, запоўнены чатырохпавярховымі стойкамі з усталяванымі на іх фірменнымі LED-лямпамі GreenPower. Навукоўцы вырошчваюць у асноўным розную салату, а таксама клубніцы. Але ўжо ў найбліжэйшы час яны пераключаць сваю ўвагу на больш каштоўныя культуры накшталт бульбы і пшаніцы. «Наша задача заключаецца ў тым, каб распрацаваць тэхналогію, якая дазволіць людзям вырошчваць смачную і здаровую ежу дзе заўгодна. Наша методыка прадугледжвае шкодныя выкіды ў атмасферу, якія-небудзь адходы або выдаткі на транспарціроўку гародніны. Плюс да ўсяго гэтая тэхналогія практычна не расходуе ваду і зямлю», — распавядае ў прэс-рэлізе кіраўнік праекта Гус ван дэр Фельтц.

Але, як было сказана вышэй, справа не толькі ў тым, каб вырасціць смачную і карысную ежу. Найперш праект накіраваны на прадухіленне харчовага крызісу на нашай планеце. Хто ведае, можа быць, у будучыні ў кожнага з нас дома будзе падобная міні-ферма са свежымі і карыснымі прадуктамі.

■ Тагасветнае

# У ЛІВЕРПУЛІ ЗДАЕЦЦА ДОМ З ПАЛТЭРГЕЙСТАМ

**У апісанні гэтага дома на сайце вядомага брытанскага агенцтва нерухомасці Rightmove падкрэсліваецца: «Папярэднія жыхары сутыкнуліся ў гэтым будынку з паранармальнай актыўнасцю».**

Дом быў выстаўлены на рынку арэнднага жылля па кошце ў 91 фунт стэрлінгаў у тыдзень, што па мясцовых мерках надзвычай танна. Аднак за гэта арандатарам давядзецца мірыцца з такой «драбязой», як палтэргейст, які нібыта там пасяліўся і часта нагадвае аб сабе.

Папярэднія арандатары запэўніваюць, што, жывучы ў доме на тры спальні, размешчаным на Піквік-стрыт (Pickwick Street) у Ліверпулі, яны сутыкнуліся са «значнай паранармальнай актыўнасцю». «У канцы XIX стагоддзя хадзілі гісторыі пра нешта тагасветнае, што наводзіла жах на ўсёй Піквік-стрыт», — распавёў эксперт па паранармальных з'явах Том Слэм. Паводле яго слоў, першыя паведамленні аб прывідзе, названым пасля «піквікскім палтэргейстам», з'явіліся больш за 130 гадоў таму.

Незвычайна ў гэтай гісторыі тое, што піквікскі палтэргейст, маркуючы па ўсім, перыядычна мяняе месца свайго пражывання. Большасць зданяў, як правіла, засяляюць нейкі адзін будынак, але ёсць і такія рэдкія экзэмпляры, якія пераносяцца з дома ў дом. Палтэргейст Піквікскай вуліцы, верагодна, з'яўляецца адным з іх. Так, гаспадыню арэнднай кватэры пад нумарам 69 місіс Яўхімію Німлок падняў з ложка, напэўна, той жа прывід, што напалохаў і яе суседа Ізмаіла Джонса, які пражывае ў кватэры пад нумарам 70. Апошняму падчас з'яўлення прывіду здалося, што дом літаральна абрынецца з прычыны раптоўнай і моцнай вібрацыі.

Аналагічныя дамы ў гэтым жа раёне здаюць у арэнду на цэлых 40 фунтаў у тыдзень даражэй, чым «дом з прывідам». Супрацоўнікі кампаніі Plus Dane, якая займаецца пытаннямі жылля сацыяльнага найму і з'яўляецца непасрэдным уладальнікам гэтай уласнасці, узгадалі, што пачалі атрымліваць паведамленні аб паранармальнай актыўнасці з 2008 года. На сайце Rightmove ў апісанні будынка прысутнічае злавесная перасцярога: «Звяртаем вашу ўвагу на тое, што папярэднія жыхары сутыкнуліся ў гэтым доме з паранармальнай актыўнасцю».

Пацвярджаючы апублікаваныя звесткі, прэс-сакратар кампаніі Plus Dane сказаў: «Упершыню мы атрымалі паведамленні пра незвычайную актыўнасць зданяў у гэтым доме ў 2008 годзе, пасля чаго супрацоўнікі з



арандатарам, спрабуючы разам знайсці шляхі вырашэння названай праблемы. Раней у нас ніколі не было такіх выпадкаў, як гэты, але мы працуем, каб дапамагаць, кансультаваць і падтрымліваць нашых арандатараў, калі яны сутыкнуліся з падобнымі праблемамі, і ставімся да пошуку шляхоў іх вырашэння вельмі сур'ёзна. Таму, імкнучыся весці сваю дзейнасць адкрытым і сумленным спосабам, мы жадаем, каб зацікаўленыя ў здыме згаданай уласнасці былі ў курсе ўсіх звестак аб пражыванні ў гэтым будынку».

...Ну як, ёсць ахвотныя пераехаць у дом з палтэргейстам?

■ Дайджэст

## ДРОН ЗЛЯТАЕ ПА ЗАМОВУ

**У Сінгапуры з'явіліся беспілотныя лятальныя апараты, якія могуць замяніць афіцыянтаў у рэстаранах. Дроны Infinium Robotics, што могуць пераносіць да двух кілаграмаў ежы і напояў, павінны з'явіцца ў адным з мясцовых бараў да канца 2015 года.**



Беспілотныя робаты кіруюцца камп'ютарнай праграмай і арыентуюцца ў прасторы з дапамогай інфрачырвоных датчыкаў. Акрамя таго, кожны з іх камплектуецца камерамі, а шрубы абаронены рашоткамі. Выкарыстоўваць робатаў было вырашана праз недахоп абслугоўваючага персаналу ў галіне: дэфіцыт афіцыянтаў у краіне складае каля 7 тысяч чалавек. Адзначаецца, што мясцовая моладзь не імкнецца працаваць у рэстаранах з прычыны невысокіх заробкаў.

Эдвард Чыа, кіраўнік сеткі рэстаранаў, у якой працуе 90 афіцыянтаў, заявіў, што дроны дазволяць скараціць колькасць персаналу ва ўстановах да 40 чалавек. Свабодных афіцыянтаў ён плануе задзейнічаць у якасці кухараў і барменаў. Але цалкам пазбавіцца ад абслугоўваючага персаналу не ўдасца, таму што дроны могуць толькі дастаўляць ежу — афіцыянтам усё роўна давядзецца расстаўляць стравы з робатаў на сталы.

## ПА КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ — НА АСТЭРОІД

**Шукальнікам скарбаў не варта глядзець толькі сабе пад ногі: неба таксама поўнае багаццяў. Нядаўна міма Зямлі праляцеў астэроід пад назвай 2011 UW158. Касмічны камень каля паўкіламетра ў даўжыню можа ўтрымліваць каштоўныя металы на агульную суму ад 300 мільярдаў да 5,4 трыльёна долараў. Такія высновы былі атрыманы з дапамогай анлайн-тэлескопа Slooh.**



Астэроід, які пранёсся за два з паловай мільёны кіламетраў ад Зямлі (у шэсць разоў далей за Месяц), нельга было ўбачыць няўзброеным вокам. Спектр адлюстраванага ім святла паказвае на тое, што ён складаецца з металаў. Навукоўцы падлічылі, што астэроід можа змяшчаць да 90 мільёнаў метрычных тон плаціны і іншых каштоўных металаў.

Прамысловае асваенне астэроідаў можа стаць прыбытковым бізнесам для прыватных карпарацый. У той час, як гравітацыя Зямлі «перацягнула« цяжкія металы глыбока ў ядро планеты, што робіць іх вельмі рэдкімі ў паверхоўным пласце, яны вельмі распаўсюджаны ў менш масіўных астэроідах. І некаторыя кампаніі ўжо прынялі гэта да ведама. Так, нядаўна кампанія Planetary Resources запусціла з МКС свой касмічны карабель з мэтай тэсціравання і адпрацоўкі тэхналогій пазаземнай разведкі. У лістападзе 2014 года зонд ESA «Філы» змог паспяхова прызямліцца на камету, чым падарыў вялікія надзеі «касмічным шахцёрам» з Planetary Resources і Deep Space Industries.

Астэроід 2011 UW158 зноў прыблізіцца да Зямлі ў 2017 годзе, але, акрамя яго, ёсць яшчэ мноства іншых «каштоўных камянёў», якія лятаюць вакол нашай планеты і чакаюць, калі мы іх даследуем.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций первого выпуска

## Совместного общества с ограниченной ответственностью «Сигмаполюс»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента.**

На белорусском языке:

полное – Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сігмаполюс»;

сокращенное – СТАА «Сігмаполюс».

На русском языке:

полное – Совместное общество с ограниченной ответственностью «Сигмаполюс»;

сокращенное – СООО «Сигмаполюс» (далее – Эмитент).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Место нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 220116, г. Минск, пр-т Дзержинского, 104, комната 1704;

телефон: (8017) 207-48-31, (8017) 277-16-57;

факс: (8017) 207-48-31, (8017) 277-29-34;

e-mail: sigmapolus@mail.ru.

**3. Основные виды деятельности Эмитента.**

Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим Уставом осуществляет следующий основной вид деятельности:

- сдача внаем собственного недвижимого имущества (70200).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.**

Денежные средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций первого выпуска, будут зачисляться на расчетный счет Эмитента в долларах США №3012101400033 в ОАО «БПС-Сбербанк».

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии, а также сроки их публикации.**

В соответствии с законодательством бухгалтерская отчетность Эмитента в средствах массовой информации не публикуется.

Информация о принятом решении о реорганизации Эмитента будет публиковаться в газете «Минский курьер» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.

Информация о принятом решении о ликвидации Эмитента будет публиковаться в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.

Информация о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) будет публиковаться в печатных средствах массовой информации, учрежденных Верховным Судом Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии облигаций первого выпуска СООО «Сигмаполюс» будет публиковаться в «Экономической газете» не позднее 7 (Семи) дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – регистрирующий орган).

**6. Сведения о депозитарии, обслуживающем эмитента.**

Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк» (далее – Депозитарий).

Место нахождения Депозитария: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь.

Депозитарий зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28.12.1991 (регистрационный №25).

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30.01.2022.

**7. Размер уставного фонда эмитента.**

Уставный фонд Эмитента составляет 67 619 (Шестьдесят семь тысяч шестьсот девятнадцать) долларов США.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о первом выпуске облигаций Эмитента принято Общим собранием участников Эмитента 25.06.2015 (Протокол №18).

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и номинальная стоимость облигаций.**

Эмитент осуществляет эмиссию бездокументарных именных, процентных, конвертируемых облигаций первого выпуска (далее – Облигации):

| Объем эмиссии Облигаций по номинальной стоимости | Количество Облигаций, штук | Серия, номера Облигаций | Номинальная стоимость Облигации |
|---|---|---|---|
| 5 000 000 долларов США | 5 000 | С-1, с 000001 по 005000 | 1 000 долларов США |

**10. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств физических и юридических лиц (включая банки) – резидентов и нерезидентов Республики Беларусь для пополнения оборотных средств и увеличения основных фондов Эмитента, финансирования текущей деятельности Эмитента. Денежные средства, полученные от размещения Облигаций, будут использованы Эмитентом в соответствии с целями их выпуска.

**11. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

В качестве обеспечения исполнения обязательств Эмитента по Облигациям выступает залог недвижимого имущества Эмитента общей стоимостью 6 780 000 (Шесть миллионов семьсот восемьдесят тысяч) долларов, собственником которого является Эмитент.

Перечень недвижимого имущества, выступающего в качестве предмета залога

| №№ | Наименование объектов недвижимого имущества | Адрес | Рыночная стоимость, долл. США | № и дата заключения об оценке |
|---|---|---|---|---|
| 11 | Помещение общественного питания с инвентарным номером №500/D-70781247; площадь – 2505,9 кв.м; назначение – Помещение общественного питания. | г. Минск, пр-т Дзержинского, 104, пом. 5 | 5 227 000 | №Н-64/15 от 24.06.2015 |
| 22 | Административно-торговое помещение с инвентарным номером №500/D-707949208; площадь – 739,6 кв.м; назначение – Административно-торговое помещение. | г. Минск, пр-т Дзержинского, 104, пом. 26 | 1 553 000 | №Н-64/15 от 24.06.2015 |
| Итого: | | | 6 780 000 | |

Размер обязательств по Облигациям составляет 73,75 процента от стоимости обременяемого залогом имущества.

Независимая оценка объектов недвижимого имущества произведена Экспертным частным унитарным предприятием «Оценка и экспертиза» (оценщик недвижимости: Пачгина Ирина Николаевна, свидетельство об аттестации оценщика №30079 от 25.05.2007, действительно до 27.05.2016), адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 11, офис 218, дата оценки – 22.06.2015.

